Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Аўторак 22 сакавіка 1938 г., № 16 (386)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ГЕРОІ-ПАПАНІНЦЫ—НА РОДНАЙ СОВЕЦКАЙ ЗЯМЛІ!

Сыны гераічнага народа

Адважныя пераможцы Арктыкі, мужныя даследчыкі Паўночнага полюса — таварышы Іван Папанін, Пётр Шыршоў, Эрнст Крэнкель, Еўгеній Фёдараў—на роднай совецкай зямлі.

Радзіма з мацярынскаю ласкай, цеплынёй і любоўю, з надзвычайнай радасцю і гордасцю сустрэла герояў—сваіх сыноў.

Новай бліскучай перамогай ганарыцца вялікая наша радзіма, наш гераічны совецкі народ. Новая, ярчэйшая старонка ўпісана ў гісторыю культуры і цывілізацыі, неапанімы ўклад унесены ў навуку. Сыны совецкага народа пакарылі полюс!

Бясстрашныя, благародныя і скромныя совецкія вучоныя ў імя і на славу совецкага народа, партыі Леніна — Сталіна, якая выхавала іх, у імя і на славу вялікага Совецкага Саюза зрабілі нечуваны ў гісторыі подвіг, які ўвойдзе ў вякі прыкладам мужнасці і гераізма людзей сталінскай эпохі.

274 дні ў суровейшых умовах, у няспыннай барацьбе са сляпой стыхіяй вялі героі-папанінцы на дрэйфуючай крызе навуковую працу, даследвалі белыя плямы Арктыкі, узбагачаючы навуку, веды чалавецтва.

Заваёва полюса была забяспечана агульным росквітам нашай краіны, тым, што мы маем лепшую ў свеце авіяцыю, маем герояў-лётчыкаў, герояў-маракоў. Пракладка Паўночнага морскага шляху, устанаўленне паветранай трасы паміж Совецкім Саюзам і Злучанымі Штатамі Амерыкі, заваёва Паўночнага полюса—звенні ажыццяўлення аднаго плана, сталінскага плана асваення Поўначы.

Нашай экспедыцыяй расшыфраваны таямніцы полюса, якія шмат вякоў ужо цікавяць чалавецтва. Па-першае, зусім дакладна ўстаноўлена, што ў раёне Паўночнага полюса няма ніякай зямлі. Глыбіня Паўночнага Ледавітага акіяна перавышае 4.000 метраў. Па-другое, устаноўлена, што на розных глыбінях Ледавітага акіяна праходзіць на поўнач слой цёплых атлантычных вод, устаноўлен кірунак дрэйфу ільду. Па-трэцяе, экспедыцыя ўстанавіла, што не толькі на ўскраінах, але і ў цэнтры палярнага басейна ёсць жывёльны і раслінны свет. Вельмі важнымі былі навуковыя работы Еўгенія Фёдарава па высвятленню геаграфічнага размеркавання земнага магнетызма ля полюса, па вымярэнню сілы земнага прыцяжэння. Рэзультаты навуковых работ станцыі «Паўночны полюс» дапамогуць нашым вучоным з большай дакладнасцю складаць лёдавыя прагнозы, якія неабходны для плавання па Паўночнаму морскаму шляху. Навуковыя працы экспедыцыі паслужаць справе далейшага росквіту паўночных ускраін совецкай зямлі.

274 дні з неаслабнай увагай сачыў увесь 170-мільённы совецкі народ за дрэйфам станцыі «Паўночны полюс», за жыццём і работай мужнай чацвёркі папанінцаў. І ўвесь свет неаслабна сачыў за легендарным дрэйфам.

Пры высадцы папанінцаў на полюс друк і некаторыя «навуковыя» дзеячы капіталістычных краін скептычна і недаверліва адносіліся да смелага пачынання, прадракалі няўдачу экспедыцыі. А фашысцкая Германія замоўчвала і фальсіфікавала весткі аб працы нашай станцыі «Паўночны полюс». Друк фашысцкіх краін абыходзіць маўчаннем і зварот папанінцаў на радзіму.

Але нельга ні замаўчаць, ні паменшыць веліч выкананай працы, славу папанінцаў, славу нашай радзімы. І ўвесь цывілізаваны свет бурна рукаплешча нашым героям, вітае іх.

«У палёце на Паўночны полюс і ў часе нашага жыцця на крызе мы адчувалі магутнасць совецкай краіны, яе тэхніку, яе неабмежаваныя магчымасці. А з такім пачуццём лёгка было і працаваць і жыць. Совецкі народ-пераможац стаяў за намі, гатовы працягнуць нам братнюю руку дапамогі». Так гавораць аб сваёй радзіме і аб сабе саміх мужныя героі ў пісьме да таварыша Сталіна.

Патрыёты соцыялістычнай радзімы — Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў—праявілі цуды мужнасці, адвагі, жалезнай вытрымкі і з гонарам выканалі заданне партыі і ўрада, сталінскае заданне.

Чырвоны сцяг краіны Советаў, які дзевяць месяцаў горда высіўся на вяршыні свету—над полюсам, над ільдамі далёкай поўначы, папанінцы ўручылі таму, хто натхніў іх на перамогу, таму, чые клопаты і ласка саграваліі іх у арктычнай сцюжы, давалі сілы і бадзёрасць,—правадыру народаў Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Перамога папанінцаў гэта трыумф усяго совецкага народа. Перамога папанінцаў—новы доказ магутнасці і культуры нашай радзімы, гераізма нашых людзей—людзей сталінскай эпохі, якім не страшны ніякія цяжкасці, бо няма на свеце такіх крэпасцей, якіх не маглі-б узяць большэвікі, партыйныя і непартыйныя.

У героях - папанінцах совецкі народ бачыць лепшыя свае рысы — мужнасць, смеласць, настойлівасць, вытрымку і адданасць партыі, соцыялістычнай радзіме. Народ, які выхоўвае такіх герояў,—непераможны!

Калі хто паспрабуе парушыць свяшчэнныя граніцы вялікага Совецкага Саюза, той адчуе грозную сілу і магутнасць соцень тысяч папанінцаў, той будзе раздаўлены і знішчаны нашым народам-пераможцам, народам-героем, выхаваным і загартаваным партыяй Леніна—Сталіна.

Толькі ў краіне соцыялізма, пад ясным совецкім сонцам могуць вырастаць такія героі, як Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў. Нашы героі цалкам і поўнасцю прысвячаюць сваё жыццё партыі Леніна—Сталіна, барацьбе за вялікую справу комунізма. Нашы героі—творцы культуры і прагрэсу.

Толькі ў краіне соцыялізма могуць так ярка расці і развівацца таленты, так паспяхова ажыццяўляцца навуковыя творчыя замыслы. Заваёва Паўночнага полюса большэвікамі, совецкімі вучонымі — яскравы доказ гэтага.

Гнеў і нянавісць усіх працоўных, усяго прагрэсіўнага чалавецтва выклікаюць «героі» капіталістычнага свету—фашысцкія грамілы, душыцелі культуры і цывілізацыі, гвалтаўнікі і варвары, што сеюць смерць у Іспаніі, Кітаі, Аўстрыі.

Пра мужнасць, адвагу папанінцаў народ песні складае. Подвіг герояў натхняе нашых пісьменнікаў, майстроў мастацтва. І ў беларускім мастацтве, у беларускай літаратуры павінны быць створаны таленавітыя творы пра мужнасць і гераізм людзей нашай сталінскай эпохі, пра герояў-папанінцаў—нашых выдатных сучаснікаў.

Мужна выканалі ганаровае заданне партыі і ўрада адважныя каманды «Мурманца», «Таймыра», «Мурмана» і «Ермака», — папанінцы на свяшчэннай зямлі сваёй радзімы.

Ленінград, Масква, уся совецкая краіна трыумфальна сустрэла герояў.

Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў вярнуліся на радзіму з самым радасным і гордым пачуццём—пачуццём выкананага абавязку перад сталінскім Цэнтральным Камітэтам, перад урадам совецкай краіны.

У Крэмлі любімаму Сталіну, кіраўнікам партыі і ўрада рапартавалі папанінцы аб паспяховым выкананні пачэснага і адказнага сталінскага задання.

Вялікі Сталін горача павіншаваў герояў. Увесь совецкі народ у адзіным парыве любві, радасці і лікавання вітае адважных сыноў шчаслівай соцыялістычнай краіны. Наш народ пяе славу бясстрашным!

Слава пераможцам Арктыкі, пакарыцелям Паўночнага полюса!

Слава героям!

Кастусь Цітоў

Песня аб папанінцах

Далёкая поўнач,
Суровыя дні,
Між снежных пустынь
Працавалі яны,
Чатыры героі
Совецкай зямлі, —
Іх волю бураны
Зламаць не маглі.

З'яднана ў калонах
Ідуць міліёны
Насустрач. А з «малай зямлі».
Кільватэрным строем
Чацвёрку герояў
Па моры вязуць караблі.

Са сцюжай
Яны ўступалі ў бой
Для славы радзімы
Сваёй маладой.
Ламалася крыга,
А мора гуло,
Тады сагравала
Іх бацькі цяпло.

З'яднана ў калонах
Ідуць міліёны
Насустрач. А з «малай зямлі».
Кільватэрным строем
Адважных герояў
Па моры вязуць караблі

Закончан вялікі
Лядовы паход,
Вітае герояў
Совецкі народ.
Ад краю да краю,
Па сушы, вадзе
Пра смелых папанінцаў
Слава ідзе.

З'яднана ў калонах
Ідуць міліёны
І песню, як сцяг, узнялі.
Любоўю бязмежнай
Страчаюць бясстрашных
Народы совецкай зямлі.

Зімоўшчыкі станцыі „Паўночны полюс“ таварышу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Цяпер, калі наша экспедыцыя завяршаецца і мы набліжаемся да Масквы, хочацца напісаць Вам, наш любімы настаўнік і друг. Мы прывыклі думаць пра Вас заўсёды — і ў дні цяжкасцей, і ў дні радасцей.

На працягу 9-ці месяцаў мы жылі на плывучай крызе, выконваючы Ваша заданне, асвойваючы і вывучаючы Паўночны полюс. І ўсю нашу працу, нашы намаганні, нашы навуковыя рэзультаты мы прысвячаем Вам дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, як даўно ўжо мы прысвяцілі партыі Леніна — Сталіна наша жыццё.

Усё, што мы зрабілі — гэта не асабісты подвіг чатырох чалавек — кожная тэхнічная альбо навуковая перамога гэта паказальнік узроўню культуры ўсёй краіны. Поспех нашай экспедыцыі быў падрыхтаван 20-цю гадамі соцыялістычных перамог пад Вашым кіраўніцтвам.

У палёце на Паўночны полюс і ў часе нашага жыцця на крызе мы адчувалі магутнасць совецкай краіны, яе тэхніку, яе неабмежаваныя магчымасці. А з такім пачуццём лёгка было і працаваць і жыць. Совецкі народ-пераможац стаяў за намі, гатовы працягнуць нам братнюю руку дапамогі. Вы, таварыш Сталін, прывілі нашаму народу тыя высокія маральныя якасці, якія вызначаюць совецкіх людзей.

На станцыі «Паўночны полюс» мы ведалі, што ў Маскву, да Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, мы павінны вярнуцца толькі з перамогай. І мы вязем Вам вынікі нашай перамогі.

Іван ПАПАНІН.
Пётр ШЫРШОЎ.
Эрнст КРЭНКЕЛЬ
Еўгеній ФЕДАРАЎ.

Сакавік 1938 года. Ленінград.

Таварышам І. Д. ПАПАНІНУ, Э. Т. КРЭНКЕЛЮ, П. П. ШЫРШОВУ, і Е. К. ФЁДАРАВУ присуджана вучоная ступень доктара геаграфічных навук

Вышэйшая атэстацыйная камісія Усесаюзнага Камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР за выдатныя заслугі і каштоўны ўклад у навуку, унесены заваяваннем і вывучэннем Паўночнага полюса, прысудзіла таварышам І. Д. Папаніну, Э. Т. Крэнкелю, П. П. Шыршову і Е. К. Фёдараву вучоную ступень доктара геаграфічных навук.

Сяргей Дзяргай

У ДОБРЫ ЧАС!

Над краем зоры рубіновыя
Гарадь — не гаснуць.
У добры час!

Калгаснік хату рубіць новую
Пад спеў калгасніц.
У добры час!

Пілот, ў прасцягу неабсяжнасці,
Ляціць на поўнач.
У добры час!

Краіна ўмее дух адважнасці
Вітаць любоўна.
У добры час!

За кожным кустам чутны шорахі,
Зважай герою!
У добры час!

На першы покліч супроць ворагаў
Устаем гарою.
У добры час!

Ткачамі знатнымі, аратымі
Наш край багаты.
У добры час!

Жыццю, змаганню, працы рады мы
І песням рады.
У добры час!

Мы маладыя, мы упартыя,
Нам свецяць зоры.
У добры час!

Мы пад штандарам роднай партыі
Не знаем гора.
У добры час!

Вёска Дуброва, Парыцкі раён.



І. Д. Папанін выступае на мітынгу ў Ленінградскім парту. Злева: Е. К. Фёдараў і П. П. Шыршоў.

Народ славіць бясстрашных герояў

СУСТРЭЧА Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ

15 сакавіка ў 4 гадзіны дня да прычальнай сценкі Ленінградскага порта павольна падышоў, расквечаны святочнымі сцягамі, ледакол «Ермак». Следам за ім падышоў гераічны карабль «Мурманец».

«Ермак» ля прычала. На палубе стаіць легендарная чацвёрка — Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў.

Працоўныя Ленінграда прышлі сустрэць герояў сваёй радзімы, пакарыцеляў Паўночнага полюса.

Першым ступае на родную зямлю Герой Совецкага Саюза Іван Дзімітравіч Папанін.

— Цвёрдая зямля! — кажа ён усхвалявана і радасна. Следам за легендарным начальнікам зімоўкі на Паўночным полюсе спускаецца па трапу Шыршоў, за ім Крэнкель і Фёдараў. Героям закідваюць кветкамі, вітаюць з прыбыццём на радзіму.

Радасны гул прывітанняў нарастае, як морскі прыбой.

Папанінцы падымаюцца на трыбуну. Побач з імі — Герой Совецкага Саюза О. Ю. Шмідт, сакратар Ленінградскага гаркома ВКП(б) тав. Кузнецоў, старшыня Ленінградскага совета тав. Пятроўскі, сваякі і блізкія герояў, кіраўнікі экспедыцыі і карабельных каманд.

Адкрываецца мітынг. Старшыня Ленінградскага совета ад працоўных горада Леніна перадае гарачае прывітанне героям-папанінцам. Яго яркая прамова неаднаразова перарываецца бурнай авацыяй і воклічамі ў гонар таварыша Сталіна і пераможцаў Арктыкі.

Ля мікрафона Іван Дзімітравіч Папанін. Папанін гаворыць. Ён дзякуе ленінградцаў за любоў і ўвагу, за цёплую і сяброўскую сустрэчу, ён гаворыць аб тым, як у самыя цяжкія мінуты ён і яго таварышы адчувалі дапамогу і падтрымку сваёй любімай радзімы і таварыша Сталіна.

З яркімі, хвалюючымі прамовамі выступілі таварышы Папаніна — Эрнст Теадоравіч Крэнкель, Пётр Пятровіч Шыршоў і Еўгеній Канстанцінавіч Фёдараў.

Мітынг закончан. Прывітальныя воклічы ў гонар герояў-папанінцаў нарастаюць з новай сілай.

У горадзе цесна. Увесь Ленінград — ад старога да малога — выйшаў на вуліцы, каб вітаць сваіх герояў.

Папанінцы гасцявалі ў ленінградцаў. Яны сустракаліся з рабочымі заводаў і фабрык, выступалі з прамовамі, дзякавалі за гасцінны і цёплы прыём.

„ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МАСКВА!“

17 сакавіка ў 4 гадзіны дня з Ленінграда ў Маскву спецыяльным цягніком прыехалі таварышы Папанін, Шыршоў, Крэнкель і Фёдараў. Разам з гераічнай чацвёркай прыехалі начальнік Галоўнага ўпраўлення Паўночнага морскага шляху тав. О. Ю. Шмідт, капітаны караблёў, якія прымалі ўдзел у экспедыцыі па зняццю папанінцаў з крыгі — тт. Барсукоў, Катцоў, Ульянаў, Варонін і іншыя ўдзельнікі экспедыцыі.

Радасна і горача сустрэла родная Масква заваявальнікаў Паўночнага полюса. Тысячы, дзесяткі тысяч людзей ішлі па вуліцах і завулках, шчаслівыя, радасныя, з высока ўзнятымі партрэтамі Папаніна, Шыршова, Крэнкеля, Фёдарава...

На пероне вакзала—сваякі, сябры і таварышы папанінцаў. Сярод іх слаўныя Героі Совецкага Саюза — Громаў, Юмашэў, Данілін, Чкалаў, Байдукоў, Белякоў, Вадап'янаў, Молакаў, Каманін, Ляпідзеўскі, Даронін, Слепнёў, баявыя таварышы гераічных зімоўшчыкаў.

Нарэшце, святочна ўпрыгожаны экспрэс падыходзіць да перона... У вокнах знаёмыя, блізкія, вясёлыя Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў.

Выбухнула «ура». Героі ў роднай Маскве. «Ура» перакатваецца нібы тысячны навальнічны гром. Вось і Комсамольская плошча. Мора людзей. Сотні тысяч масквічоў прышлі вітаць народных герояў. Ярка палыхаюць чырвоныя сцягі. Высока ўзняты партрэты папанінцаў над галовамі шматлюднага мора.

На трыбуне — сыны вялікага народа. Над імі ўзняты сцяг з партрэтам тав. Сталіна, сцяг, які дзевяць месяцаў горда рэяў над ільдамі суровай арктычнай пустыні.

Першым з прывітальнай прамовай ад імя ЦК ВКП(б), СНК СССР, маскоўскіх арганізацый і ўсіх працоўных чырвонай сталіцы выступіў в. а. сакратара МК і МГК ВКП(б) тав. А. І. Угараў. Затым выступае Герой Совецкага Саюза Отто Юльевіч Шмідт.

Бура апладысментаў узрушае плошчу, калі з прывітальным словам да масквічоў звяртаецца начальнік легендарнай зімоўкі, Герой Совецкага Саюза І. Д. Папанін.

Мітынг закончан. Пад воклічы, поўныя захаплення, і прывітанні народа героі-папанінцы, разам з удзельнікамі экспедыцый на ледаколах, накіраваліся ў машынах, апавітых кветкамі, у Крэмль.

Да самага Крэмля нарастаў прывітальны гул у гонар папанінцаў. Здавалася, што ўсё грыміць і спявае, спявае ўся неабдымная чатырохмільённая Масква.

Гэта была незабыўная сустрэча герояў са сваім народам, герояў, якія зрабілі сапраўды незвычайны подвіг.

Масква — сталіца сусвету — у гэты дзень цёпла і радасна, ад душы вітала сваіх дарагіх, любімых народных герояў—Папаніна, Шыршова, Крэнкеля, Фёдарава.

ПРЫЁМ У КРЭМЛІ ГЕРАІЧНЫХ ЗІМОЎШЧЫКАЎ СТАНЦЫІ „ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС“

Проста з вакзала гераічныя зімоўшчыкі станцыі «Паўночны полюс» таварышы Папанін, Шыршоў, Крэнкель і Фёдараў прыехалі ў Крэмль. У Вялікім Крэмлёўскім палацы Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР наладзілі прыём у гонар адважных герояў — пераможцаў Паўночнага полюса.

Да пяці гадзін вечара ў Георгіеўскую залу Вялікага Крэмлёўскага палаца сабраліся прадстаўнікі партыйных і совецкіх арганізацый сталіцы, совецкай грамадскасці, культуры і навукі. Сярод прысутных — Героі Совецкага Саюза, удзельнікі паветранай экспедыцыі на Паўночны полюс і экспедыцыі па зняццю папанінцаў з дрэйфуючай крыгі, камандзіры Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота, стаханаўцы заводаў і фабрык Масквы, дзеячы навукі і мастацтва, лётчыкі, канструктары.

Натхнёнымі воплескамі сустрэлі сабраўшыяся паяўленне ў зале адважных заваявальнікаў Паўночнага полюса. Яны ўвайшлі ў залу, пастроіўшыся ў чоткую шарэнгу. Паперадзе ішоў начальнік легендарнай станцыі Іван Дзімітрыевіч Папанін Ён нёс у руках сцяг з партрэтам таварыша Сталіна, які ў маі мінулага года быў узняты над Паўночным полюсам і горда веяў над лёдавым лагерам да апошніх дзён станцыі. Следам за Папаніным ішлі яго верныя таварышы—Крэнкель, Шыршоў, Фёдараў, кіраўнікі экспедыцыі па зняццю зімоўшчыкаў на чале з О. Ю. Шмідтам, сваякі і блізкія палярнікаў.

Паяўленне ў зале таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава, Калініна, Кагановіча, Мікаяна, Касіора, Жданава, Ежова, Эйхе, Дзімітрава і Шкіратава было сустрата поўнымі захаплення авацыямі ў гонар таварыша Сталіна і кіраўнікоў партыі і ўрада.

Таварыш Сталін і яго саратнікі сардэчна вітаюць, абнімаюць і цалуюць пакарыцелей полюса. Адкрываючы прыём, таварыш Молатаў абвяшчае тост за слаўных папанінцаў. Уся зала, стоячы, апладыруе гераічнай чацвёрцы.

Таварыш Молатаў падымае бакал за капітана «Таймыра» тав. Барсукова, кіраўніка экспедыцыі на «Таймыры» тав. Остальцэва, капітана «Мурмана» тав. Катцова, капітана «Мурманца» тав. Ульянава, капітана «Ермака» тав. Вароніна, кіраўніка экспедыцыі О. Ю. Шмідта і іншых удзельнікаў экспедыцыі. Наступны тост таварыш Молатаў абвяшчае за здароўе сем'яў адважнай чацвёркі, іх сваякоў і блізкіх і сем'яў маракоў.

Герой Совецкага Саюза тав. О. Ю. Шмідт падымае бакал за здароўе таварыша Сталіна. Тост сустракаецца бурнай, натхнёнай авацыяй, крыкамі «ура» і прывітальнымі воклічамі. Доўга цягнецца дэманстрацыя любві і адданасці таварышу Сталіну.

Бурнымі воплескамі сустракаецца тост, абвешчаны за главу совецкага ўрада таварыша Молатава.

Тав. Молатаў падымае бакал за гераічных совецкіх лётчыкаў, якія даставілі папанінцаў на Паўночны полюс, за таварышоў Вадап'янава, Молакава, Аляксеева, Мазурука, Галавіна і іншых удзельнікаў паветранай экспедыцыі. Вячаслаў Міхайлавіч напамінае аб дырыжаблі «В-6», які павінен быў прыняць удзел у зняцці папанінцаў з крыгі, але загінуў з-за выпадковасці. Тав. Молатаў абвяшчае тост за здароўе членаў сем'яў камандзіра дырыжабля тав. Гудованцэва і яго спадарожнікаў.

Затым тав. Шмідт абвяшчае тосты за старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. М. І. Калініна, за народнага камісара абароны маршала Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылава, за народнага камісара Ваенна-Марского Флота тав. Смірнова, за народнага камісара цяжкой прамысловасці тав. Л. М. Кагановіча, за народнага камісара ўнутраных спраў тав. Н. І. Ежова, за старшыню камісіі па арганізацыі зняцця папанінцаў з крыгі тав. А. І. Мікаяна, за кіраўніка ленінградскіх большэвікоў тав. А. А. Жданава.

З яркай, маляўнічай прамовай выступае Герой Совецкага Саюза начальнік станцыі «Паўночны полюс» тав. І. Д. Папанін. Ён дакладвае таварышу Сталіну, кіраўнікам партыі і ўрада, што заданне, даручанае зімоўшчыкам, выканана поўнасцю.

Таварыш Сталін абвяшчае тост за здароўе папанінцаў. Прысутныя ў зале сустракаюць тост шумнымі воплескамі.

Далей тав. Шмідт падымае бакал за народнага камісара замежных спраў тав. М. М. Літвінава, народнага камісара абароннай прамысловасці тав. М. М. Кагановіча, за ленінскі комсамол і яго кіраўніка тав. Косарэва.

Пасля выступлення Героя Совецкага Саюза тав. Чкалава слова прадастаўляецца таварышу Сталіну. У зале грыміць авацыя, раздаюцца прывітальныя воклічы: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Ура—таварышу Сталіну!»


Таварыш Сталін гаворыць яркую прамову аб совецкім гераізме, аб мужнасці совецкіх палярнікаў і лётчыкаў. Прамова таварыша Сталіна была сустрэта бурнай, доўгай авацыяй.

На прыёме таксама выступалі Герой Совецкага Саюза тав. М. В. Вадап'янаў, славуты радыст дрэйфуючай станцыі тав. Э. Т. Крэнкель.

Для прысутных на прыёме быў дадзен вялікі канцэрт, у якім удзельнічалі Чырвонасцяжны ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі СССР, лепшыя артысты сталіцы, ансамбль чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці часцей пагранічных і ўнутраных войск НКВД СССР.

УСЁСІЛЬНАЕ ВУЧЭННЕ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

Бягучы год багаты знамянальнымі датамі, якія адносяцца да жыцця Маркса і гісторыі марксізма. 14 сакавіка споўнілася 55 год з дня смерці вялікага настаўніка і правадыра рабочага класа, 5 мая споўніцца 120 год з дня яго нараджэння. 90 год мінула з моманту выхаду «Маніфеста Комуністычнай партыі» — першага праграмнага дакумента марксізма.



КАРЛ МАРКС. Рысунак мастака П. Васільева. Саюзфото.

Чверць стагоддзя назад, у сакавіку 1913 года, паявіліся выдатныя артыкулы Леніна: «Гістарычны лёс вучэння Карла Маркса» і «Тры крыніцы і тры састаўных часткі марксізма». Першы з іх паявіўся 14 сакавіка 1913 года ў «Правде», другі быў змешчаны ў большэвіцкім тэарэтычным журнале «Просвещение». Трыццаць год назад у красавіку 1908 года, Леніным быў напісаны артыкул «Марксізм і рэвізіянізм».

***

«Вучэнне Маркса ўсёсільнае, таму што яно правільнае», — пісаў Ленін у артыкуле «Тры крыніцы і тры састаўных часткі марксізма».

У гэтых простых словах выказана надзвычай глыбокая думка. Крыніца сілы і неперамржнасці марксізма — у тым, што ён правільны. Ен дае адзіна надзейную ніць, каб разабрацца ў складаным лабірынце рэчаіснасці. Іменна пагэтаму ён стаў баявой тэарэтычнай зброяй таго класа, перад якім гісторыя паставіла велічную задачу карэнным чынам змяніць рэчаіснасць, выратаваць чалавецтва ад іга капітала, вывесці грамадства на светлы і радасны шлях соцыялізма.

Калі марксізм нарадзіўся, існавалі безлічныя соцыялістычныя секты і групы, кожная з сваім вучэннем, з асобым сімвалам веры. Агонь гістарычных бітваў змёў з твару зямлі ўсе рознавіднасці дамарксавага соцыялізма. І ў гэтым-жа агні бессмяротнае вучэнне Маркса загартавалася і ператварылася ў сталёвую, непахісную сілу.

У чым «сакрэт» праваты і сілы марксавага вучэння? Яно ўзнікла як згустак і вышэйшае дасягненне ўсёй папярэдняй гісторыі чалавецтва, «як простае і непасрэднае **прадоўжанне** вучэння найвялікшых прадстаўнікоў філасофіі, палітычнай эканоміі і соцыялізма» (Ленін). «Радаслоўная марксізма ахапляе слупавую дарогу сусветнай цывілізацыі, тую дарогу, на якой вехамі служаць Арыстоцель і Дэмакрыт, Джардана Бруно і Капернік, Н'ютон і Дэкарт, Сміт і Рыкардо, Сен-Сіман, Фур'е і Оуэн, Гегель і Фейербах. Маркс асвоіў і крытычна перапрацаваў гіганцкую культурную спадчыну.

Тое, над чым білася ў ціскох безвыходных, здавалася, супярэчанняў перадавая думка чалавецтва, было бліскуча вырашана Марксам. «Мы не гаворым свету: «перастань змагацца, уся твая барацьба — пусцякі», — мы даем яму ісціны лозунг барацьбы»,— пісаў Маркс яшчэ ў ранняй маладосці. Барацьба, і прытым барацьба за самыя ўзвышаныя мэты, якія калі-небудзь ставіла перад сабой чалавецтва, была яго стыхіяй на працягу ўсяго жыцця, бо «філосафы толькі розным чынам **тлумачылі** свет, але справа заключаецца ў тым, каб змяніць яго».

Каб упершыню ў гісторыі прыступіць да свядомага змянення свету, патрэбна была новая, раней небывалая сіла. Гэтай сілай валодае рабочы клас, узброены вучэннем Маркса. «Яно поўнае і стройнае, даючы людзям цэльнае светаназіранне, непрымірымае ні з якімі забабонамі, ні з якой рэакцыяй, ні з якой абаронай буржуазнага гнёту» (Ленін).

А ворагі марксізма? Ці могуць яны даць людзям стройнае і цэльнае светаназіранне?—Вядома, не! Іх безыдэйнасць і спустошанасць дасягаюць сваёй крайняй граніцы ў фашызме — гэтым смуродным прадукце гніення буржуазнага ладу. Фашысцкая «тэорыя» — памыйная яма ўсіх экскрэментаў ідэалагічнага развіцця чалавецтва, усіх брыдотнейшых забабонаў і рэакцыйнага трызнення. Калі можна гаварыць аб радаслоўнай фашызма, дык гэта — убогі пералік спехам наскубаных як папала «ідэй» чалавеканянавісніцтва, мракабесся і бескультур'я, якія выклікалі грымасу агіды ў сучаснікаў. Чаго варты, напрыклад, напоўзвар'яцелы рэакцыянер граф Габіно, родапачынальнік фашысцкай «расавай тэорыі»!

З распаўсюджаннем капіталізма раслі раздзіраючыя яго антаганізмы. Рост галечы пролетарыята і нажывы капіталістаў, эксплаатацыя сялянскіх мас памешчыкамі, банкамі, купцамі, руйнавальныя крызісы і спусташальныя войны, палахлівае здрадніцтва буржуазнай дэмакратыі і першыя баі рабочага класа, чэрвеньскае паўстанне і Парыжская Комуна — уся стракатая тканіна з'яў зноў і зноў пацвярджала праваты вучэння Маркса. І разам з тым расла сіла марксізма. Ен прасочваўся ў кожную краіну, уступіўшую на шлях капіталістычнага развіцця. Ен станавіўся баявым сцягам, настаўленнем да дзеяння для мільённых мас.

Чверць стагоддзя назад Ленін закончыў агляд гістарычнага лёсу марксавага вучэння наступнымі словамі: «Пасля паяўлення марксізма кожная з трох вялікіх эпох сусветнай гісторыі прыносіла яму новыя пацвярджэнні і новыя трыумфы. Але яшчэ большы трыумф прынясе марксізму, як вучэнню пролетарыята, надыходзячая гістарычная эпоха».

Прароцкія словы! Яны спраўдзіліся са здзіўляючай дакладнасцю. Імперыялізм давёў да крайняй ступені абвострання ўсе супярэчанні буржуазнага ладу. Соцыялістычная рэволюцыя пролетарыята стала на парадак дня. Яна перамагла ў 1917 годзе на гіганцкіх прасторах нашай радзімы. Пачалася новая эра сусветнай гісторыі.

Ва ўмовах новай эпохі неперамржнае вучэнне Маркса і Энгельса было распрацавана, развіта і ўзнята на новую, вышэйшую ступень геніем Леніна. Расчысціўшы аўгіевы канюшні скажэння і апашлення марксізма апартуністамі II Інтэрнацыянала, ён адрадзіў замураваны імі рэволюцыйны змест марксізма. Але Ленін гэтым не абмежаваўся. У новых гістарычных абставінах ён падсумаваў велізарны вопыт рэволюцыйных баёў пролетарыята. Ен узняў сцяг бязлітаснай барацьбы супроць меншавіцкіх еўнухаў, якія спрабавалі ператварыць самае жыццё — здольнае вучэнне чалавецтва ў мумію, няздольную да развіцця. Як і ўсякі жывы арганізм, бессмяротнае вучэнне Маркса і Энгельса можа жыць толькі развіваючыся. Ленін даў далейшае развіццё марксізма прыстасоўна да змяніўшыхся ўмоў барацьбы рабочага класа за сваё вызваленне.

«Ленінізм ёсць марксізм эпохі імперыялізма і пролетарскай рэволюцыі. Дакладней: ленінізм ёсць тэорыя і тактыка пролетарскай рэволюцыі наогул, тэорыя і тактыка дыктатуры пролетарыята ў асаблівасці», — гласіць класічнае азначэнне ленінізма, дадзенае таварышом Сталіным. Вучэнне аб дыктатуры рабочага класа — галоўнае ў марксізме. Гэта-ж вучэнне складае галоўны змест, сэрцавіну ленінізма. Бо, як падкрэслівае таварыш Сталін, «ленінізм нельга ні аддзяляць ад марксізма, ні тым больш супроцьстаўляць марксізму». Вялікая соцыялістычная рэволюцыя ў СССР наочна паказала ўсяму свету, што «адгэтуль **адзіным** носьбітам і аплотам марксізма з'яўляецца ленінізм, комунізм» (Сталін). У работах таварыша Сталіна марксісцка-ленінскае вучэнне жыве і бліскуча развіваецца ў эпоху найвялікшых перамог соцыялізма ў СССР, у эпоху нябачанай барацьбы двух сістэм.

Чырвоны сцяг дыктатуры рабочага класа ўжо дваццаць з лішкам год вее над нашай краінай. У выніку праробленай ёю тытанічнай пераўтваральнай работы соцыялізм у асноўным пабудаван у СССР. Першая фаза комунізма стала шчаслівай і радаснай явай нашых дзён. Гэта — найвялікшая ўрачыстасць марксізма-ленінізма. Гісторыя ведае нямала разнастайных вучэнняў аб законах і шляхах развіцця чалавечага грамадства. Але яна не ведае ні адзінага прыкладу, калі на долю якога-небудзь вучэння выпала-б урачыстасць, хоць-бы ў аддалёнай ступені, нагадваючая найвялікшую перамогу марксізма-ленінізма.

Па той бок граніц нашай соцыялістычнай радзімы дзесяткі мільёнаў працоўных і эксплаатуемых усё зноў і зноў на багацейшым вопыце пераконваюцца ў праваце марксізма-ленінізма. Фашысцкія мракабесы бахваляцца, быццам яны «знішчылі марксізм». Ідыёцкая брахня здзічэлых ландскнэхтаў капітала, што наважыліся спальваннем кніг і зверскімі забойствамі павярнуць назад кола гісторыі! Кожны паварот гэтага кола цяпер, як і раней, зноў пацвярджае бессмяротную праваты марксісцка-ленінскага вучэння.

***

«Дыялектыка гісторыі гэткая, што тэарэтычная перамога марксізма прымушае ворагаў яго **пераапранацца** марксістамі» — пісаў Ленін 25 год назад у артыкуле «Гістарычны лёс вучэння Карла Маркса». Ленін геніяльна прадбачыў, што барацьба з ворагамі, якія апранаюцца ў марксісцкую вопратку, разгорнецца «у непараўнана больш буйных памерах, калі пролетарская рэволюцыя абвострыць усе спрэчныя пытанні, сканцэнтруе ўсе рознагалоссі на пунктах, што маюць самае непасрэднае значэнне для вызначэння паводзін мас, прымусіць у запале барацьбы аддзяляць ворагаў ад прыяцеляў, выкідваць дрэнных саюзнікаў для нанясення рашучых удараў ворагу».

Вопыт жыцця паказаў, што пасля **практычнай** перамогі марксізма яго ворагі, што маскіруюцца марксістамі, ідуць на найвялікшыя злачынствы, даходзяць да агіднейшых рэкордаў здрады, подласці і вераломства. Вядома, што яшчэ царская ахранка ад сваіх правакатараў патрабавала вывучаць марксісцкую тэорыю, каб ім лягчэй было ўцерціся ў арганізацыі змагаючагася пролетарыята. Быў нават жандарскі генерал Спірыдовіч, які па абавязку службы пісаў гісторыю рэволюцыйных партый. У сучаснай Германіі фашысцкая ахранка «тэарэтычна» абучае правакатараў, пасылаемых у рабочыя арганізацыі.

Несумненна, што з'явай падобнага-ж парадку былі ўсе «тэарэтычныя» практыкаванні мярзаўцаў тыпу Бухарына, Троцкага і інш. Скрозь нібы марксісцкую фразеалогію гэтых разбэшчаных наймітаў фашызма тырчэлі асловыя вушы халопаў буржуазіі, рэстаўратараў капіталізма. Варта толькі ўспомніць, напрыклад, прэславутую «тэорыю перманентнай рэволюцыі», контррэволюцыйны паклёп аб немагчымасці пабудовы соцыялізма ў нашай краіне, бухарынскі заклік «узбагачайцеся», «тэорыю арганізаванага капіталізма» і т. д. і т. п. Пераапранаючыся марксістамі, трацкісцка-бухарынскія бандыты выконвалі самыя брудныя і агідныя даручэнні фашысцкіх разведак, генеральных штабаў імперыялістычных агрэсараў

«Ен у мяне будзе не горш за Гебельса», — у гэтых цынічна адкравенных словах крывавага сабакі Ягоды падагульняецца ўся «тэарэтычная» дзейнасць Бухарына. Банда палітычных прастытутак выкрыта, знішчана. Такі лёс чакае ўсіх ворагаў, як-бы яны ні пераапраналіся, як-бы яны ні маскіравалі свае злачынныя мэты і дзеянні.

Вораг арудуе фальшывым пашпартам. У Германіі фашысцкія галаварэзы, каб ашукаць самыя адсталыя слаі, прыбягаюць да антыкапіталістычнай дэмагогіі. Сваю партыю дваровых псоў фінансавага капітала яны імянуюць «нацыянал-соцыялісцкай». Сваімі бруднымі лапамі яны спрабуюць апаганіць свята Першага мая, чырвоны сцяг пролетарскай барацьбы, нават матывы рэволюцыйных песень яны, сказіўшы і апаганіўшы, «скарысталі» у якасці маршаў штурмавікоў.

А іх трацкісцка-бухарынскія найміты хлусяць і двурушнічаюць, забіваюць лепшых барацьбітоў за комунізм, шпіёняць, шкодніччаюць. Як гаворыць французская прыказка — які гаспадар, такі і слуга.

Чорная здрада, вераломства, прадажніцтва і хлуслівасць — гэткія каінавыя рысы ворага. Сумленнасць, ідэйнасць, бездакорная праўдзівасць, высокая прынцыповасць — гэткія рысы марксізма-ленінізма. Яснасць і акрэсленасць, бясстрашнасць у баю, бязлітаснасць да ворагаў вызначаюць палітычных дзеячоў ленінска-сталінскага тыпу, барацьбітоў марксісцка-ленінскай загартоўкі. Гэтай зброяй марксісцка-ленінскае вучэнне атрымала гіганцкія сусветна-гістарычныя перамогі. Гэтай зброяй яно пераможа ўсіх сваіх ворагаў у надыходзячых баях за комунізм.

І. ФЕДАРАЎ.
(«Правда»).



«НА ФРОНТ!». Плакат іспанскага мастака Бардасамо. Саюзфото.

Анатоль Астрэйка

ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЕ

Як туман, рассціláўся па вуліцах
Едкі дым учарашніх атак,
А Парыж спахмурнеў і сутуліцца,
Бы ў крывавых падцёках салдат.

Барыкады прыціхлі напружана,
Нібы горад раптоўна замёр.
Цішынёю Парыж перагружаны...
Так маўчыць перад бураю бор.

Будзе ранне,—атака адновіцца,
Будзе бой—аж зямля задрыжыць.
Комунары ніколі не скорацца,
Комунары вякі будуць жыць!

Грымнуў выбух магутны, бязлітасны,
Гэта гнеў змардаваных людзей
Раптам сілай нязмерна вялікаснай
Іррвануўся на волю з грудзей.

Гнеў народа руйнуе Бастыліі,
Краты турмаў жалезныя гне,
Бо няма больш магутнейшай сілы,
Чым народа нянавісць і гнеў.

Крумкачы наляцелі версальскія,
Вылез з логава жудасны звер,
І Комуну крывавымі пальцамі
Задушыў кат народа Т'ер.

Гул пракляцця стаяў па-над Сенаю
Сеяў смерць Галіфе—генерал.
Калі кроў ручукамі струменіла, —
Рагатаў люты Т'ер—канібал.

Сена несла забітых, знявечаных,
Сена плакала горка наўзрыд.
Не слязьмі, а крывёй чалавечаю
Сена плакала горка тады.

Ваша кроў пралілася не дарам, —
Сцяг Комуны над светам гарыць.
Слава вечная вам, комунары,
Чалавечай вясны змагары!

Хай паспрабуе Гітлер наважыцца
Закрануць гэты велічны сцяг,—
На сваёй-жа зямлі ён уляжацца,
На сваіх-жа уласных касцях;

Гнеў народа зруйнуе Бастыліі,
Задрыжыць, як асіна, зямля,
Бо няма больш магутнейшай сілы,
Чым краіны совецкай сям'я.

Міхась Калачынскі

КОМУНЫ СЦЯГ

Мой горад рана ўстае,
Вясёлы, звонкі, малады;
Ідзе на вуліцы свае,
На плошчы, скверы, у сады.

І я выходжу раніцой
Праспектам роўным у прасцяг,
Над хатай радаснай маёй
Палошча вецер горды сцяг.

Гарыць ён ранняю зарой,
Гарыць, як сонечны маяк.
Вітанне, родны горад мой,
Вітанне, родная зямля!

Было калісьці — на зары
З падвалаў чорных і цямніц
Ішоў спрацованы Парыж
Жыццём сцяг гэты бараніць.

Ішоў і адступаў назад
Цаною смелых змагароў...
Рады радзелі барыкад,
На вуліцах гусцела кроў.

Яна не змыта; над зямлёй
Ірдзее горда ў вяках —
Гарыць над хатаю маёй
Чырвоны сцяг, Комуны сцяг.

М. АРКАДЗЬЕЎ

СПРАВА ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ ЖЫВЕ!

67 год таму назад упершыню ў гісторыі чалавецтва дзяржаўная ўлада перайшла ў рукі рабочага класа. 18 сакавіка 1871 года рэволюцыйныя пролетары Парыжа ўзяліся за зброю і абвясцілі Комуну, якая з'яўляецца «першай, слаўнай, гераічнай, але ўсё-ж беспаспяховай спробай пролетарыята павярнуць гісторыю супроць капіталізма» (Сталін).

Парыжская Комуна ўяўляла сабою «смяртэльную пагрозу для старога свету, заснаванага на прыняволенні і эксплуатацыі» (Ленін). Узнікнуўшая стыхійна, не зусім ясна ўяўляўшая сабе свае задачы і спосабы іх ажыццяўлення, яна, тым не менш, правільна ішла па шляху палітычнага і эканамічнага вызвалення працоўных. Разбурыўшы старую, прагніўшую ваенна-бюракратычную дзяржаўную машыну, Комуна прыцягнула да кіраўнічай работы ў дзяржаўным апараце тысячы рабочых і работніц. Сталую армію, гэтую сляпую прыладу ў руках пануючых класаў, яна замяніла ўсеагульным узбраеннем народа. Аддзяліўшы царкву ад дзяржавы, экспрапрыіраваўшы царкоўную маемасць, Комуна нанесла сакрушальны ўдар прыладзе духоўнага прыгнечання працоўных. «У чыста соцыяльнай галіне яна паспела зрабіць небагата, але гэта небагатае ўсё-такі даволі ярка ўскрывае яе характар, як народнага, рабочага ўрада...» (Ленін). Была забаронена начная праца ў булачных, адменена сістэма штрафаў. Фабрыкі і майстэрні, кінутыя ці спыненыя сваімі гаспадарамі, перадаваліся рабочым арцелям. Былі прыняты пастановы аб растэрміноўцы кватэрнай платы, аб арганізацыі бірж працы.

Парыжская Комуна з'яўлялася новым, нябачаным яшчэ тыпам дзяржаўнай улады — улады, выяўляўшай інтарэсы пролетарыята, усіх прыгнечаных і абяздоленых. Яна імкнулася вярнуць працоўным свабоду і шчасце, адабраныя ад іх эксплаататарамі. Газета «Комуна» пісала: «Парыж хоча... зямлі для сялян, прылад працы — для рабочых, работы — для ўсіх».

Парыжская Комуна спрабавала разбіць аковы капіталізма, але не паспела іх разбіць. Абкружаная падвойным кальцом ворагаў — версальскай контррэволюцыі і германскіх акупантаў, — яна пратрымалася ўсяго 72 дні. Французская буржуазія, якая заключыла саюз з ворагамі Францыі, нямецкімі драпежнікамі, ярасна абрушылася на рэволюцыйны Парыж, зламіўшы гераічнае супраціўленне комунараў. Горад быў затоплен крывёю. Каты Т'ер і Галіфе, чые прэзрэнныя імёны пракляты навекі, са звярынай лютасцю распраўляліся з комунарамі, забіваючы і параненых, і жанчын, старых і дзяцей. 30 тысяч чалавек былі расстраляны, 36 тысяч саслана на катаргу, 50 тысяч кінуты ў турэмныя засценкі.

Паражэнне Парыжскай Комуны было выклікана не толькі колькаснай перавагай і лепшым узбраеннем буржуазіі. Комуна загінула, перш за ўсё, таму, што ў яе не было такой партыі, як наша большэвіцкая партыя, — адзіная і мэтанакіраваная, кіруючая народам і арганізуючая яго; бясстрашная ў баю і бязлітасная да ворагаў народа; свабодная ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека; мудрая і непаспешлівая пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў. У Комуны такой партыі не было, «кіраўніцтва рэволюцыяй падзялялі між сабой дзве партыі, з якіх ні адна не можа быць названа комуністычнай партыяй» (Сталін).

Партыя Леніна—Сталіна нястомна змагалася і змагаецца з ворагамі народа, выкрываючы іх пад хоць-якой маскай, ушчэнт сакрушаючы іх супраціўленне, узнімаючы супроць іх ярасць мас, да канца, без астатку знішчаючы подлае варожае атрэп'е. Корань нашых перамог — у непрымірымасці большэвікоў у адносінах да ўсіх і ўсялякіх ворагаў, у бязлітаснай барацьбе з імі і знішчэнні іх. Парыжская Комуна гэтага не рабіла. Яна спынілася на поў шляху, стараючыся зрабіць маральны ўплыў на сваіх ворагаў, тады як іх трэба было змесці з твару зямлі. Карыстаючыся гэтым, буржуазія наваднiла Парыж сваімі шпіёнамі, правакатарамі, дыверсантамі і шкоднікамі, якія спакойна падрыхтоўвалі паражэнне Комуны, расчышчалі шлях Т'еру і Галіфе. Комунары не былі дастаткова пільнымі, не спынілі ў час шкодніцтва і сабатажу, якія асабліва сказаліся на рабоце чыгунак. Комунары былі недапушчальна мяккімі ў адносінах контррэволюцыйнай падлы. У той час, як совецкі народ адразу-ж пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі павёў, пад кіраўніцтвам большэвікоў, рашучы наступ на ворага, парыжскі пролетарыят «марудзіў і даў час версальскаму ўраду сабраць цёмныя сілы і падрыхтавацца да крывавага майскага тыдня» (Ленін).

Мяккасць комунараў у адносінах да ворагаў знайшла сваё выяўленне і ў тым, што Парыжская Комуна не абяззброіла буржуазію эканамічна. У той час, як адным з першых мерапрыемстваў совецкай улады была нацыяналізацыя банкаў і ўсіх сродкаў і прылад вытворчасці, Парыжская Комуна ў імя «вышэйшай справядлівасці» пакінула некранутымі велізарныя капіталы буржуазіі, якія хаваліся ў Французскім банку, не канфіскавала буйнейшых заводаў і фабрык, не ўзяла ў свае рукі кіраванне чыгункамі.

Партыя Леніна—Сталіна нястомна мацавала і мацуе саюз рабочага класа з працоўным сялянствам. Непарушны гэты саюз — аснова нашых перамог, магутнасці нашай радзімы. Парыжская Комуна не мела апоры ў працоўным сялянстве. Рэволюцыйны Парыж, адрэзаны блакадай ад усёй астатняй Францыі, не здолеў прыцягнуць на свой бок сялянства, свайго натуральнага саюзніка. Сялянскія рэзервы засталіся на баку буржуазіі.

Але пры ўсіх сваіх памылках Комуна з'яўляецца найвялікшым узорам найвялікшага пролетарскага руху XIX стагоддзя. Яна адыграла сапраўды бязмерную ролю ў міжнародным рабочым руху, у вызваленчай барацьбе ўсяго працоўнага чалавецтва.

Справа не толькі ў тым, што гром парыжскіх гармат прагучаў над усім светам, як набатны звон, які кліча да баёў, узнімае пролетарыяў на барацьбу з эксплаататарамі. Справа не толькі ў тым, што Парыжская Комуна дала штуршок рэволюцыйна-соцыялістычнай дзейнасці. Значэнне Парыжскай Комуны, перш за ўсё, у тым, што яна з'явілася прадвяшчальніцай Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Комуна не толькі ўпершыню ў гісторыі давяла на практыцы пролетарыяту, што ён можа выйсці пераможцам з барацьбы з капіталізмам, можа ўзяць дзяржаўную ўладу ў свае рукі, але і паказала, як ён павінен гэта зрабіць. Парыжская Комуна была зародкам новай формы дзяржавы, якая ўпершыню за ўвесь час існавання чалавецтва завяршыла вызваленне працоўных, забяспечыла ўсім працоўным шчаслівае, заможнае і культурнае жыццё, — дзяржавы соцыялістычнай, дзяржавы совецкай. Скарыстаўшы вопыт Парыжскай Комуны і першай рускай рэволюцыі, В. І. Ленін «адкрыў Совецкую ўладу, як дзяржаўную форму дыктатуры пролетарыята» (Сталін).

Вялікія ідэі, за якія гераічна змагаліся і паміралі комунары, увасоблены ў жыццё на адной шостай земнага шара. Тое, да чаго імкнуліся, аб чым марылі комунары, стала явай, здабыта і заваявана, і навекі замацавана ў найвялікшай хартыі свабоды — у Сталінскай Канстытуцыі.

Кроў, пралітая комунарамі, не прайшла дарма. Справа Комуны не памерла, яна да гэтага часу жыве ў кожным з нас, ва ўсім працоўным чалавецтве. Гераічны прыклад парыжскіх пролетарыяў і па гэты дзень натхняе ўсіх байцоў супроць эксплаататараў, супроць фашызма, за соцыялізм.

Вопыт Парыжскай Комуны, узбагачаны і памножаны вопытам Кастрычніка, вопытам будаўніцтва соцыялістычнага грамадства пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, стварыў неперамржную стратэгію рэволюцыйнай барацьбы. Совецкі народ, як і працоўныя ўсяго свету, добра памятае ўрокі Парыжскай Комуны. Совецкі народ бязлітасна знішчае ўсіх і ўсялякіх ворагаў. Расціснута трацкісцка-бухарынская гадзіна. Будуць знішчаны ўсе астатнія, што ўцалелі яшчэ, фашысцкія ўблюдкі. Наша Чырвоная Армія, магутная і несакрушальная, гэтак-жа моцная духам, як гераічныя байцы Парыжскай Комуны, ніколі не паўторыць памылак Комуны. Яна будзе не абараняцца, а наступаць. Яна знішчыць ворага на яго-ж тэрыторыі, у тым самым «Версалі», адкуль ён наважыцца пасягнуць на свяшчэнную нашу зямлю.

67 год таму назад крывавы карлік Т'ер, затапіўшы Парыжскую Комуну ў моры крыві, заявіў: «Цяпер з соцыялізмам пакончана і надоўга!» Кат жорстка памыліўся, як памыляюцца яго фашысцкія патомкі — Гітлер, Мусаліні і іжэ з імі.

Фашысцкія ізуверы, вартыя нашчадкі версальскіх шалёных псоў, замышляюць нізвергнуць соцыялістычны лад, разграміць Совецкі Саюз.

Марна! Не было, няма і не можа быць на свеце такой сілы, якая магла-б адабраць нашу свабоду і незалежнасць, якая магла-б загасіць светач соцыялізма, запалены яшчэ парыжскімі комунарамі. Справа Комуны жыве, сцягі яе калыхаюцца над мільёнамі, чалавецтва няўхільна і непахісна рушыць усё наперад і наперад—да комунізма— і недалёка той час, калі з капіталізмам, з фашызмам будзе пакончана назаўсёды.

(«Красная Звезда»).

Сталін у беларускай совецкай паэзіі

У канцы 1937 года Беларускае дзяржаўнае Выдавецтва выдала добрую кнігу — «Сталін у беларускай совецкай паэзіі». У гэтай кнізе сабраны вершы і паэмы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Пятруся Броўкі, Пятро Глебкі, Андрэя Александровіча, А. Ушакова, Э. Агняцвет, А. Жаўрука пра геніяльнага і мудрага правадыра прапоўнага чалавецтва—вялікага Сталіна. Тут-жа змешчаны «Пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну» і «Дванаццаць песень».

Такое выданне патрэбна толькі вітаць, бо гэта кніга ўяўляе вялікую мастацкую каштоўнасць. Гэта — кніга соцыялістычнай лірыкі. У ёй выказана падзяка дарагому і любімаму правадыру таварышу Сталіну за нашу самую дэмакратычную ў свеце Канстытуцыю, за наша шчаслівае і радаснае жыццё.

Беларускі народ у пісьме вялікаму Сталіну з лірычным пафасам расказаў дарагому правадыру, бацьку і настаўніку аб сваім сучасным шчаслівым і заможным жыцці, аб новых людзях — стаханаўцах прамысловасці і калгасных палёў, аб росквіце культуры, аб Совецкай Беларусі, якая зззяе прыгожаю зоркай у сузор'і адзінаццаці сваіх сясцёр — рэспублік СССР. Усё гэта расказана нашымі паэтамі ярка, маляўніча, карцінна, жыва, у хвалюючых песенных рытмах, па-народнаму простых і меладычных.

Гэта пісьмо, яшчэ па-сапраўднаму неацэненае нашай крытыкай, можна назваць мастацкай эпапеяй, у якой беларускі народ гаворыць аб Сталіне, як аб самым дарагім чалавеку. Сталін — гэта жыццё народа, яго шчасце, радасць і покліч да барацьбы:

Твой вобраз, як покліч, устаў над
зямлёю,
Заве пераможна ісці ў барацьбе.
Мы ўсе ля Крэмля, наша сэрца з
табою,
І першая думка у нас—пра цябе
Ты сонца для нас, што зямлю
асвяціла
І ласкай сагрэла палі, гарады.
Ты рэк поўнаводных імклівая
сіла.
Празрыстасць крыніц — дарагі
правадыр!
Праз тры рэволюцыі, бітвы,
паўстанні
Ты вёў разам з Леніным нашы
рады...
Ты нашых садоў і палёў
красаванне,
Ты наша вясна—дарагі правадыр!
Табе — наша радасць, любоў і
адданасць.
Табе пяе славу сусветная шыр.
Вядзі нас, любімы, табой мы
з'яднаны,
Ты наша жыццё — дарагі
правадыр!

У творах народных паэтаў Я. Купалы і Я. Коласа ў вобразе Сталіна ўвасоблена свабоднае, шчаслівае і радаснае жыццё беларускага народа. Янка Купала ў лірычнай паэме «Табе, правадыр» звяртаецца да таварыша Сталіна:

Табе, правадыр, мае песні і думы,
І шчырыя шчырага сэрца парывы!
Бо хто калі сніў, ды і хто калі
думаў,
Што буду я вольны, што буду
шчаслівы.
. . . .
Ты мудры прышоў, правадыр;
Апалі туманы, імгла,
Па свеце і ўдоўжкі, і ўшыр
Шчаслівая слава пайшла.
. . . .
Цвіце, каласіцца мой край,
Ці сонейка захад, ці ўсход!
Аб Сталіне песні спявай!
Спявай, беларускі народ!

Якуб Колас у сваіх творах спявае аб Сталіне, як аб найвялікшым чалавеку, які здолеў пракласці людзям шлях да шчаслівага жыцця:

Праз гады-сталецці
Марылі аб шчасці
Людзі ўсіх краін.
К шчасцю-ж шлях прымеціў,
К праўдзе шлях пракласці
Здолеў ты адзін.

У вершы Я. Коласа «Сталінская Канстытуцыя» вобраз Сталіна паўстае як вобраз вялікага гуманіста, як сімвал чалавечага шчасця:

Не было нідзе спрадвеку
У жыцці такіх прагалін,
Дзе-б пашану чалавеку,
Аддалі, як дае Сталін.

У вершы «Сталінскія арляняты» Я. Купала і ў вершы «Прывет» Я. Колас даюць вобраз комсамольскай і совецкай моладзі. Я. Купала называе моладзь сталінскімі арлянятамі. Гэты вобраз нашых комсамольцаў і комсамолак з'яўляецца праўдзівым, ён надоўга застаецца ў чытача:

Ці то сушы, ці то моры,
Ці то высі паднябесся —
Усюды стрэнем непакораў,
Комсамольцаў нашых, з песняй
Хай там бура - завіруха,
Хай пурга сапе і плача,
Стуль тваё пачуе вуха
Комсамольскі гарт юначы.
Далей, вышай, у прасторы,
Па ўраджай з сяўбы багаты,
Комсамольцы-вярнігоры,
Сталінскія арляняты.

У Якуба Коласа совецкая моладзь—гэта «племя маладое, зямель совецкіх яснацвет», якому «комсамольскія сцягі» «даручыў таварыш Сталін»:

Прывет вам, племя маладое,
Зямель совецкіх яснацвет!
Дарога ваша — шлях герояў,
У новы дзень бліскучы след.
Як сонца, першыя ў паходзе,
Стыхіям злым наперакор,
Ішлі вы з песняй, як раздолле,
На штурмы скал і дзікіх гор.
І вам дарогу саступілі
Пустэчы, пушчы і снягі,
Бо даручыў таварыш Сталін
Вам комсамольскія сцягі.

Наша совецкая моладзь — мужная і адважная—выхавана партыяй Леніна — Сталіна, выхавана нашым правадыром. Пятрусь Броўка ў вершы «Самая шчаслівая» дае вобраз гераічнай совецкай моладзі, якая з'яўляецца дзецішчам нашага Сталіна:

Гэта яго думы, яго дзеці
І яго жаданняў буйны рост.
Самая прыгожая ў свеце
У краіне нашай — маладосць!
Ей не страшны вецер золкі, люты,
Ні буран, ні штормы, ні віхор...
Вось яна ляціць на парашутах,
Пагасціўшы недзе каля зор.
Сталіну мы скажам: родны, блізкі,
Мы гатовы ўсе, — ты нас бяры —
Узляцець высока, як Усыскін,
І сябе для справы падарыць.

У рэцэнзуемым зборніку паэзіі змешчана вядомая паэма Пятра Глебкі «Мужнасць», напісаная яшчэ ў 1934 годзе. У паэме паказана ўсенароднае гора нашай краіны з прычыны смерці В. І. Леніна і клятва таварыша Сталіна над трунной геніяльнага арганізатара і правадыра большэвіцкай партыі. Тое, што Глебка ўзяўся за гэтую палітычна-адказную і патрэбную тэму, гаворыць аб паэтычнай смеласці і сіле паэта. І трэба сказаць, што паэма (за выключэннем асобных рытачных і адцягненых радкоў) з'яўляецца творчай удачай Глебкі.

У простых і суровых словах перадае Глебка клятву тав. Сталіна над трунною Леніна:

— Мы людзі адменнага складу:
Сыны векавой барацьбы.
Нам дадзена права і радасць
У ленінскіх шэрагах быць.
Заўсёды-ж у маршах паходных
у жорсткіх баях, у агні,
высока партыйную годнасць
павінен трымаць комуніст.
Так гаварыў нам Ленін,
навек пакідаючы нас.
Клянемся,
таварыш Ленін,
што мы ажыццёвім наказ.

Далей Глебка паказвае, як пасля смерці Леніна, пад кіраўніцтвам Сталіна, ідучы па ленінскаму шляху, мы здзейснілі заветы Леніна і пабудавалі соцыялістычнае грамадства ў нашай краіне.

Заканчваецца паэма «Мужнасць» радкамі, у якіх рысуецца вобраз Леніна, як неад'емная частка нашага жыцця, і вобраз Сталіна, як вялікага прадаўжальніка справы Ільіча:

Мінае час няшчаднай смерці,
смуткуем зноў аб ім усе,
і кожны з нас глыбока ў сэрцы
часцінку Леніна нясе.
. . . . .
І мы ніколі не прыстанем
ні ў цяжкай працы, ні ў хадзе,
бо з намі наш любімы Сталін,
бо з намі партыя ідзе,
бо чуем кожнае імгненне
і кожнай кропляю крыві —
Вялікі і магутны Ленін
сярод жывых
ідзе жывы.

Вялікі вобраз Леніна жыве ў справах большэвіцкай партыі і ва ўсёй сваёй паўнаце праяўляецца ў геніяльным Сталіне. Сталін — гэта Ленін сёння, — сказаў французскі пісьменнік Барбюс. І наша совецкая паэзія, наша вусная народная творчасць толькі ў такім выглядзе і рысуе вобраз Сталіна. У нашай паэзіі вобраз Сталіна рысуецца, як вобраз прадаўжальніка вялікай справы Леніна. Вось чаму рэцэнзуемы зборнік патрэбна было-б назваць «Ленін і Сталін у беларускай совецкай паэзіі», дадаўшы сюды яшчэ некаторыя паэтычныя рэчы аб Леніне.

Цікавым вершам у разглядаемым зборніку паэзіі аб Сталіне з'яўляецца верш Аркадзія Куляшова «Бацька». А. Куляшоў у гэтым вершы знайшоў новыя паэтычныя дэталі для паказу вобраза Сталіна, як роднага і любімага бацькі совецкага народа.

Вось які наказ дае паэт сваёй маленькай дачцы:

І на радзіму—з водгуллем па рэках,
Наказ мой прыдзе, што даю цяпер:
Дачка мая, ты ўбачыш чалавека...
Любі яго, як я люблю цябе.

Ен бацька мой, сям'і ў яго багата,
Яго красой красуецца зямля,
Ен кожны год, калі бывае свята,
Ідзе на плошчу Красную з Крэмля.

Зірні на рысы твару дарагога,
Як я, ты зразумееш зноў і зноў,
Што гэта бацька родны, у якога
Шмат на вяку загінула сыноў.

У паэтычных адносінах слабейшымі вершамі рэцэнзуемага зборніка з'яўляюцца вершы: «Урачыстасць» А. Ушакова, «Шчаслівы дзень» і «Таварышу Сталіну» Эдзі Агняцвет, «Размова сяброў» А. Куляшова, «Нашай славы зара» П. Глебкі і інш.

Агульным паэтычным недахопам гэтых вершаў з'яўляецца празаічнасць, няўменне канкрэтна, пачуццёва асвайваць тэму, знаходзіць новыя вобразныя мастацкія дэталі. Замест канкрэтнасці, яркасці і жывасці ў большасці толькі-што названых вершаў пануе абстрактнасць і расплывучатасць. Прыкладам гэтага можа служыць верш «Нашай славы зара» П. Глебкі.

Яркая прыветлівым і строгім
Мудрым геніем правадыра,
Ты прайшла вялікія дарогі,
Нашай славы ясная зара.
Прамяністая, высокая, над намі
Ты ў паходах баявых ішла,
Цёмнымі асеннімі начамі,
Асвятляла незнаёмы шлях.

Часта: ад няўмення канкрэтна і пачуццёва асвоіць вобраз, знайсці мастацкую, жывую і яркую дэталь, у вершах Агняцвет і Ушакова сустракаецца празаічная сухасць. Напрыклад, у Агняцвет:

Мы разам з дэлегаткамі ўставалі,
Спяваць хацелася бясконца нам.

Альбо ў А. Ушакова:

І чутны словы ў бурнай сіле
З усіх краін, з усіх дарог,
І мудры кліч імчыць на крыллях
І трубіць радасць перамог.

Вобраз вялікага Сталіна нашы паэты павінны паказаць такім, якім нарысаван самім Сталіным вялікі вобраз Леніна, бо Сталін — гэта Ленін нашых дзён. Таварыш Сталін у сваёй прамове на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы, гаворачы аб задачах дэпутатаў у Вярхоўны Совет, нарысаваў бяссмертны вобраз вялікага Леніна. Ен сказаў аб нашых дэпутатах, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа ўскладняецца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, як быў Ленін, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, як быў Ленін, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін.

Такім чалавекам, палітычным дзеячом і правадыром быў Ленін, такім чалавекам, палітычным дзеячом і правадыром з'яўляецца таварыш Сталін. Залатыя словы таварыша Сталіна аб Леніне павінны з'яўляцца жывой крыніцай для нашых паэтаў у паказе манументальных мастацкіх вобразаў геніяў чалавецтва — Леніна і Сталіна.

Кніга «Сталін у беларускай совецкай паэзіі» з'яўляецца яркім паказчыкам мастацкага росту нашых беларускіх паэтаў, якія змаглі ў паэтычнай форме выказаць самыя задушэўныя пачуцці радасці і шчасця, любві і адданасці беларускага народа партыі Леніна — Сталіна і нашаму любімаму і дарагому правадыру таварышу Сталіну.

Міх. ЛАРЧАНКА.

КІНО

„Вялікі грамадзянін“

Совецкая кінематаграфія ўзбагацілася новым таленавітым творам—фільмам «Вялікі грамадзянін». Фільм пастаўлен рэжысёрам Ф. Эрмлерам па сцэнарыю М. Блеймана, М. Бальшынцова і Ф. Эрмлера.

На экране—першая серыя фільма. Але яна мае самастойнае мастацкае значэнне, з'яўляецца поўнакаштоўным творам, які пераканаўча і праўдзіва паказвае гераічную барацьбу большэвіцкай партыі з подлымі здраднікамі, трацкісцка-зіноўеўскімі двурушнікамі і капітулянтамі напярэдадні XIV з'езда партыі — з'езда індустрыялізацыі.

Падзеі адбываюцца ў буйным пролетарскім цэнтры. 1925 год. Трацкісцка-зіноўеўскія мярзаўцы спрабуюць перашкодзіць партыі Леніна—Сталіна ажыццявіць праграму індустрыялізацыі краіны, праграму будаўніцтва соцыялізма. Трацкісцка-зіноўеўскія двурушнікі прабраліся да кіраўніцтва губернскай партыйнай арганізацыяй. Яны — сакратар губкома Карташоў і кіруючы работнік губкома Бароўскі—шальмуюць сумленных майстроў завода «Чырвоны металіст», рацыяналізатараў Каца і Дубка, арганізоўваюць цкаванне адданых справе Леніна—Сталіна комуністаў—сакратара райкома Пятра Шахава, сакратара заводскай ячэйкі Калеснікава, імкнучыся дыскрэдытыраваць іх і разам з тым, праз сваю агентуру, вылучыць у дэлегацыю на XIV з'езд партыі сваіх стаўленікаў.

Пётр Шахаў раскрывае здрадніцкія планы Карташова і Бароўскага. У «Праўдзе» паяўляецца яго артыкул, які зрывае маскі з трацкісцка-зіноўеўскіх двурушнікаў. ЦКК пасылае для азнаямлення з становішчам арганізацыі таварыша Максіма. Карташоў робіць спробу давесці Максіму, што масы падтрымоўваюць кіраўніцтва губкома. Але манеўр ворагаў партыі раскрываецца. Масы — комуністы, рабочыя—пры дапамозе Максіма і Шахава разгромілі трацкісцка-зіноўеўскае кіраўніцтва губкома.

У другой частцы фільма—падзеі 1927 года. Выкрытыя і разгромленыя партыяй трацкісцка-зіноўеўскія двурушнікі пераносяць сваю дзейнасць у падполле. Глядач бачыць, як склаўся смуродны гнойнік падполля трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскіх бандытаў, агентуры фашызма, які канчаткова выкрыт, разгромлен і ліквідаван партыяй і совецкім народам толькі ў апошнія годы. Апошняя спроба трацкістаў-зіноўеўцаў апеліраваць да мас у 1927 годзе скончылася поўным крахам. І яны ў падполлі ствараюць эмоўніцкія групы, звязваюцца з замежнымі разведкамі, арганізоўваюць шкодніцтва, шпіянаж і дыверсіі. А совецкі народ у гэтым — 1927 годзе адзначыў вялікія перамогі індустрыялізацыі краіны. «Чырвоны металіст» пры актыўнай дапамозе і садзейнічанні новага сакратара губкома Шахава даў краіне першы трактар. Уся партарганізацыя, увесь пролетарскі калектыў пад сцягамі партыі Леніна—Сталіна святкуюць урачыстасць соцыялістычных перамог.

Фільм яркімі мастацкімі сродкамі паказвае адну з старонак гісторыі партыі Леніна—Сталіна, гісторыі барацьбы за канчатковую перамогу соцыялізма.

Цэнтральны вобраз фільма—страсны трыбун, бліскучы арганізатар мас, валевы і мужны большэвік Пётр Шахаў. Гэты тыповы вобраз большэвіка таленавіта стварыў актор Н. Багалюбаў.

Захапляе і абаяльны вобраз Максіма (засл. арт. В. Чыркоў), які добра вядомы гледачу па ранейшых работах аўтароў гэтага фільма. Верны сын большэвіцкай партыі Максім энергічна і мужна выкрывае і громіць трацкісцка-зіноўеўскіх двурушнікаў, змагаецца за ачышчэнне радоў партыі ад заклятых ворагаў, змагаецца за справу Леніна—Сталіна. Максім вырас—стаў буйным партыйным работнікам, загартаваўся ў барацьбе. Але ён паранейшаму просты і шчыры.

Праўдзівыя вобразы подлых ворагаў партыі, ворагаў народа—трацкісцка-зіноўеўскіх двурушнікаў, стварылі акторы І. Берсенеў (Карташоў), О. Жакаў (Бароўскі).

Акторскі калектыў фільма ўвогуле надзвычай добра справіўся з выкананнем роляй. Але ёсць у фільме асобныя недапрацоўкі. Да іх трэба аднесці вялікую загружанасць прамовамі, недастаткова арганічна звязаную з сюжэтам лінію кахання Надзі і Калеснікава, недастатковую акрэсленасць вобраза Ольгі—жонкі Карташова.

З'яўленне на экране фільма «Вялікі грамадзянін» (вытворчасць «Ленфільма») сведчыць аб няспынным росквіце совецкай кінематаграфіі. Наша мастацтва ўзбагацілася новым таленавітым творам на партыйную тэматыку, фільмам пра гераічную барацьбу партыі Леніна—Сталіна за перамогу соцыялізма.

Р. ЮРЫН.



КАДР З ФІЛЬМА «ВЯЛІКІ ГРАМАДЗЯНІН». Шахаў віншуе рабочых—рацыяналізатараў Каца і Дубка. На тракт тары — Надзя.

Новыя творы

Ю. ВІЦЬБІЧ

ЯКУШ СВІТКА і МАРКІЗ ПАСТОРЭ

(Урывак з рамана „За радзіму“)

Томбер, бер, бер,
Саутэр, тэр, тэр,
Томбер саутэр фолер

— Чорт вазьмі! Паэзія таксама капрызна, як панна Далеўская! — заўважае маркіз, схіліўшыся над аркушам паперы і расшпільваючы каўнер палкоўніцкага мундзіра.

З яго пакоя відаць Рынкавую плошчу. Па масту праз Віцьбу гарнізонныя кухары, ахрыпла лаячыся на ўсіх еўрапейскіх мовах, гоняць выбракаваных коней. Каля бернардзінскага касцёла спыніўся грузны дармез, з якога вылез такі-ж самы грузны памешчык. Прakланіўшыся, ён уголас моліцца:

— Святы Антоне, са слязьмі прашу цябе я, пан Бітны-Шляхта. Дапамажы імператару Напалеону і пакарай хлопа майго неўгамаванага Якуша.

Да ратушы марудна крочыць худы, барадаты харват у форме ілірыйскага сапёра, абыякава распытваючы сустрэчных.

— Сябра, дзе тут дом для тых, хто паміраe?

Маркіз не бачыць Рынкавую плошчу. Перад яго вачмі ўстае цяпер Вільня, бал і чароўная панна, з якой ён праве́ў увесь час. У канцы бала аркестр старой гвардыі зайграў урачысты марш «Перамога за намі!» — і яснавяльможная грамадскасць горада з захапленнем закрычала:

— Віват, цэзар! Няхай жыве вялікая Польшча ад Кракава да Віцебска!

За вокнамі палаца гарэзлівы вецер калыхаў рознакаляровыя ліхтаркі ілюмінацыі. Здавалася, што статуі амбітных каралёў Рэчы Паспалітай ажываюць, схіляюцца і таксама падаюць да ног імператара Напалеона. Развітаючыся, панна Далеўская паднесла маркізу тры ружы:

— Харобраму пану Пасторэ за Вільню, за Коўню, за Гародню.

Какетліва адводзячы ў бок руку з чацвертай ружай, яна, усміхаючыся, дадала:

— А вось гэтую вы атрымаеце за Віцебск.

І сёння маркіз піша раманс аб палаванзе і ружах. Чарговы кур'ер перадасць яго ў Вільні прывабнай панне, а адтуль прывязе ў Віцебск заслужаную чацвертую кветку. Для дваццацігадовага палкоўніка гэтая кветка, магчыма, не менш каштоўна, чым ордэн. Толькі дзе патрэбная рыфма? Знайсці яе таксама цяжка, як спаймаць Якуша Світку.

Томбэр, саутэр, фо...

І раптам палкоўнік уздрыгнуў, правёў адной рукой па шыі, а другую паклаў на эфес саблі. Паэзія яму здрадзіла. Гэтыя рыфмы належаць да песні, якую ён ніколі не забудзе:

Яшчэ, маркіз, апошні крок —
Канец твой зараз, крывасмок.
Яшчэ адзін паветра глок
І галава адскоча ў бок.

Яе спяваў, здаецца зусім нядаўна, стары бунтар Парыж. Імператар Напалеон выратаваў галовы арыстакратаў ад гільётыны санкюлотаў. Таму палкоўнік Пасторэ пойдзе за ім праз Расію да самых берагоў Ганга, атрыманы ад яго ордэн Пачэснага Легіёна каштоўней за ўсе польскія ружы. Скомканая папера з рыфмамі паляцела ў кошык. Маркіз зашпільвае каўнер мундзіра.

Калі імператар пасля незвычайнага для сябе двухтыднёвага раздумвання накіроўваўся з Віцебска да Масквы, ён сказаў інтэнданту Беларускага дэпартамента:

— Глядзіце на Беларусь, як на саюзніцу, а не як на заваяваную краіну, але помніце, што я не кароль жакерыі.

— Чорт вазьмі, гэтых саюзнікаў! — думае маркіз. — Нарэшце, проста невядома, хто сёння тут гаспадар — ці губернатар Пужэ з інтэндантам Пасторэ, ці гэты неўлавімы Якуш Світка. Беларусь нагадвае другую Іспанію, а Віцебск асаджоную гверыльясамі Сарагосу. На поўнач ад горада пануюць казакі Селіванава. Яны абнаглелі настолькі, што нядаўна прыязджалі маліцца аб перамозе над французамі ў віцебскі Маркаў манастыр. На поўдзень бадзяюцца партызаны з атрадаў Світкі. Каб знішчыць гэтых праклятых беларускіх Нептунаў з трохзубцамі, трэба ўстанавіць у кожнай вёсцы гільётыну. У самым горадзе, акрамя выгнаных партызанамі з маёнткаў польскіх памешчыкаў, няма асабліва на каго пакласціся. Учора, пасля прамовы мясцовага ксяндза Палонскага аб адраджэнні Польшчы ў яе былых межах, купец першай гільдыі Алесь Бібка пры агульнай падтрымцы мяшчан крыкнуў:

— Брэшаш, ляша, па Нёман наша!

Сёння жандары затрымалі чыноўніка былога губернскага праўлення Шалалая, які ў прыватнай гутарцы даводзіў, што Віцебск спаліць лягчэй, чым Маскву. Нават простая бабка па мянушцы Сямігжоніха распаўсюджвае чуткі, нібы даўно памершы Сувораў ніколі не паміраў і цяпер зноў ідзе біць французаў. Гарнізон, за выключэннем польскіх уланаў і вестфальскіх гусараў, уяўляе з сябе дэмаралізаваную сумесь усіх палкоў і нацый вялікай арміі. Замест таго, каб падтрымаць гэты гарнізон, маршал Сен-Сір, разбіты пад Полацкам генералам Вітгінштэйнам, патрабуе тэрмінова накіраваць да яго ў Сянно 48 лінейны полк. Які гэта полк? Дзе ён? Хоць тут мне хваляваца няма чаму. Гэта справа губернатара, а не інтэнданта, знаходзіць адпаведныя палкі і накіроўваць іх па прызначэнню. Хопіць з мяне экспедыцый па вёсках і складання бюлетэняў да імператара.

Маркіз падыходзіць да стала, завострывае пёрка і заканчвае чарговы бюлетэнь.

«Людзі, што жывуць у вёсках Беларусі і складаюць большасць яе насельніцтва, — піша ён, — невысокія ростам але моцнага складу. Яны носяць палатняныя кашулі, порткі і своеасаблівую світку, падпярэзаную вяровачкай. На нагах у іх туфлі, сплеценыя з кары падобна таму, як у Францыі плятуць кошыкі для ўпакоўкі.

Кругазор гэтых людзей абмежаваны сваёй вёскай. У іх зусім няма палкіх альбо пяшчотных пачуццяў. Гэта ледзь кранутыя культурай скіфы».

І ў той момант, калі інтэндант Пасторэ пісаў бюлетэнь імператару Напалеону, насілу знойдзены губернатарам Пужэ 48 лінейны полк рушыў да маршала Сен-Сіра. Гэты полк, сфарміраваны яшчэ ў Егіпце, узнагароджаны арлом за Луэрштэт, амаль цалкам знішчылі пад Віцебскам суворaўскія дзіва-багатыры генерала Остэрмана. Шмат чаго бачыў стары карабінер, які сёння стаяў вартавым ля магілеўскай рагаткі горада, але і ён здзівіўся, атрымаўшы на запытанне: — Хто ідзе? — адказ: — 48 лінейны полк!

Увесь полк складалі грэнадзёр, барабаншчык і маркітанка. Карабінер спачувальна паглядзеў ім услед, вылаяў у думках начальства:

«Шкада таварышоў. Сёння-ж іх замучае гэты звер Світка».

Але ўголас нічога не сказаў. Нельга салдату абмяркоўваць загады маршала.

. . . .

Рослы, вусаты, з густымі бакенбардамі грэнадзёр цяжка кульгаў, абапіраючыся на кіёк. Яму нядаўна адрэзалі па калена нагу. Перад ім цяпер ляжыць логі, звілісты, як жыццё, шлях. І ёсць пра што балюча ўспомніць. Калі нарадзіўся грэнадзёр 48 лінейнага палка, не білі ў званы і не стралялі з гармат. Толькі паспела павітуха перавязаць пупавіну, як бацька схапіў дзіцянё на рукі і пачаў падкідваць пад столь мансарды:

— Гопля! Гопля! Крычы! Мацней крычы! Адразу відаць, што патрыёт і парыжанін! А потым, каб крыху супакоіць занадта ўжо галаслівага хлопчыка, заспяваў:

Вось і нарадзіўся Жан Луазо,
А ў гэтым вінаваты Жан-Жак Руссо.

Гаменам удзельнічаў Жан Луазо ў рэволюцыі, штурмаваў Бастылію, распаўсюджваў «Друг народа», стаяў з факелам ля труны Марата, барабаншчыкам рэволюцыйнай арміі Пішагру змагаўся з прусакамі і, нарэшце, апынуўся ў грэнадзёрах Напалеона. Гэта менавіта яму сказаў імператар, што ў яго грэнадзёрскім ранцы знаходзіцца жэзл маршала. І, здрадзіўшы санкюлотам, Жан Луазо шукаў гэты жэзл і пад пірамідамі Егіпта, і на перавалах Альпаў, пад Іенай і Ваграмам, пад Аустэрліцам і Фрыдландам. За ім ён прышоў і ў далёкую Расію. Сотні рознамоўных салдатаў, абараняючы свае бацькаўшчыны, загінулі ад яго каліснці якабінскага ружжа. Дзесяткі рэдутаў заваёваны ім, а яны не варты адной барыкады. Цяпер, кульгаючы да Сянно з ранцам, у якім ляжыць звычайнае шыльца і мыльца, грэнадзёр з жахам думае, як далёка Парыж. Усё-ж яго мужнасць адпавядае яго росту і ён бадзёра камандуе:

— Эн! Дэ! Труа!
— Эн! Дэ! Труа!*)

— Дойдзем да Францыі, — думае Жан Луазо. — Імператар не спакіне свайго старога, восем разоў параненага салдата.

Побач з грэнадзёрам ідзе чатырнаццацігадовы, вясёлы, як дрозд, кірпаты хлапец, сын селяніна з Шампані. Бацька паслаў яго да Банапарта, каб не прышлі зноў Бурбоны і не адабралі кавалак зямлі, які раней належаў сеньёрам. Хлопец змагаецца за гэты кавалак пад Рэйнам, пад Дунаем, пад Эльбай. Каб падбадзёрыць свой лінейны полк, ён пасля каманды грэнадзёра б'е ў свой неадлучны барабан і з яго яшчэ зусім дзіцячых вуснаў злятае таксама неадлучная песня:

Барабаншчык Поль Гантран
Б'е ў грымотны барабан.

У гэты самы барабан ён біў і тады, калі французы расстрэльвалі іспанскіх і беларускіх сялян. Імператар-жа абяцаў Полю прырэзаць яшчэ зямлі.

Разам з грэнадзёрам і барабаншчыкам спяшаецца маркітантка Лізбет. Прыгожая жанчына, высокая, смелая, бесцырамонная, сапраўдная маркітанка, унучка спаленага гугенота і ўдава забітага салдата. Калі патрэбна, Лізбет у баю адкідвала ў бок бачонак з віном і хапалася за стрэльбу.

— Трусы! Пад маёй спадніцай вам усім не хопіць месца! — крычала яна, заўважыўшы, што яе полк пачынае адступаць, і гэтыя словы прымушалі пачарнелых ад парахавога дыму салдат кідацца ў самае пекла. Цяпер маркітанка нясе на руках дзіцянё, якое нарадзілася ў Віцебску. Хто яго бацька — Лізбет добра не ведае. Можа, шасціфутавы драгун з італьянскай гвардыі, ці жвавы егер з лёгкай кавалерыйскай брыгады генерала Карбіно, а магчыма імператарскі мамелюк. Вельмі ўжо рослы, жвавы і смуглявы хлапец. Бацькі загінулі пад Барадзіным, але затое засталася матка. І за гэтае дзіцянё Лізбет кожнаму, хто толькі там уперадзе паспрабуе яе затрымаць, перарве глотку. Пяшчотна прыціскаючы да сябе маленькага чалавека, захутанага ў кавалак кавалерыйскай папоны, яна ахрыплым голасам пяе:

Спі, Жульен, спі.
Салаўі пяюць,
Люцікі цвітуць...
Спі, Жульен, спі.

З хмарнага неба падаў дробны снег. На зямлі ён адразу растаіваў, і ногі ў стаптаным абутку вязнулі ў гразі. Халодны, рэзкі вецер дзьмуў проста ў твар і ад яго не баранілі дзіравыя ад расійскіх штыхоў мундзіры. Пачыналася лютая зіма 1812 года.

Адразу за Віцебскам пайшлі па шляху адна за адной спаленыя вёскі. Вакол іх бадзяліся здзічэлыя сабакі, і нідзе вочы не заўважвалі людзей. Тут у верасні прайшла карная літуанская калона польскіх уланаў пад камандай маркіза Пасторэ.

— І добра, што нідзе не відаць людзей з гэтых вёсак, — сказаў грэнадзёр, калі шлях пачаў апускацца ўніз да рэчкі. — Не хочацца мне з імі сустрэцца. Ад іх нам чакаць літасці нельга. Асабліва ад гэтага ката Світкі. Ціха, — насцярожыўся ён. — Нешта дымам запахла.

— Сто-ой! — крыкнуў нечакана нехта з боку. Французы спалохана спыніліся.

З абскубанага ветрам гаю, дзе вакол вогнішчаў сядзелі людзі, выйшла на шлях каля дзесятка партызанаў на чале з сівым дзедам. Абутыя ў лапці, партызаны апрануліся вельмі стракатa. На адных паверх кажухоў былі нацягнуты чорныя шынелі кананіраў, на другіх сінія — пехацінцаў, на трэціх, малінавыя, гусараў. Таксама стракатa яны і ўзброіліся. Хто меў ружжо, хто пісталет, хто саблю, хто піку, але большасць трымала ў руках вілы, сякеркі і дубінкі. Сам дзед адрозніваўся ад іншых сваёй звычайнай сялянскай вопраткай. Падперазаўшы белую світу каляровым поясам з кутасікамі, ён засунуў за яго з правага боку рукавіцы і пару пісталетаў, а з левага — кірасірскі палаш і капшук з люлькай.

*) Ваенная каманда: —Раз Два! Тры!

(Працяг на 4-й стар.).

МАЯ РАБОТА НАД ОПЕРАЙ

Калі я задумаў пісаць оперу, першай маёй задачай было: знайсці сюжэт. Задача нялёгкая. Я яшчэ ўлетку 1936 года звязаўся з паэтам П. Броўкам і мы з ім тады-ж спыніліся на сюжэце перыяду імперыялістычнай вайны. Паказаць беларускага батрака, які вырастае ў барацьбіта-рэвалюцыянера пад уздзеяннем падзей вайны і рэвалюцыі, паказаць піцерскага рабочага-бальшэвіка Анішчука, які дапамагае росту батрака Міхася, паказаць бедную сялянскую дзяўчынку Марысю, побыт дарэвалюцыйнай беларускай вёскі, вясельныя абрады, драпежную сям'ю кулака Закрэўскага, нарэшце, галоўнае—паказаць адзін з эпізодаў падзелу памешчыцкай зямлі ў перыяд Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі — вось асноўнае, што прыцягнула нашу ўвагу пры распрацоўцы абранага намі сюжэта.

Усю работу па канчатковай аддзелцы лібрэта П. Броўка рабіў у шчыльнейшым кантакце са мною, і я лічу такую сумесную работу лібрэтанта з кампазітарам з першых-жа дзён неабходнай умовай для стварэння поўнакаштоўнага опернага твора. К вясне 1937 года лібрэта было ў асноўным закончана і я вмог прыступіць да напісання музыкі.

Да гэтага, пакуль П. Броўка пісаў лібрэта, я збіраў неабходны песенны матэрыял; пры гэтым перабраў і, па меры сваіх сіл, грунтоўна вывучыў найбагацейшы песенны фальклор беларускага народа, выбраў асноўныя песні, прыпеўкі, меладычныя звароты, патрэбныя для абранага намі сюжэта. У гэтай папярэдняй рабоце вялікую дапамогу мне аказалі кампазітары І. І. Любан, Н. Ф. Сакалоўскі і іншыя, а таксама работнік Акадэміі навук БССР тав. Грынблат. У той-жа час я грунтоўна вывучаў гістарычны матэрыял, які адносіцца да 1917 года і да работы бальшэвіцкіх арганізацый на Заходнім фронце.

Выбар сюжэта прадвызначыў характар оперы: багацце масавых сцэн, вялікае месца хора, рад «другарадных», але вельмі важных персанажаў, неабходнасць унясення ў музыку героікі, рэвалюцыйнага пафасу. Опера разбіта на шэсць карцін (чатыры акты): у першым і апошнім актах па адной карціне, у двух сярэдніх—па дзве. Карціны наступныя: першая карціна—лета 1915 года, высокі бераг рэчкі, сустрэча Міхася з Марысяй, чарговая мабілізацыя і провады Міхася на вайну. Другая карціна—зіма 1915 года, вяселле ў доме Закрэўскіх, зварот паранenага Міхася. Трэцяя карціна—восень 1916 года, провады маладых новабранцаў, разрыў Марысі з Міхасём, сустрэча яго з Анішчуком і паўторны адыход Міхася на вайну. Чацвертая карціна — верасень 1917 года, на фронце, арышт і вызваленне Анішчука, спроба Міхася падняць паўстанне ў арміі і арышт Міхася. Пятая карціна—кастрычнік 1917 года, развал фронта, вызваленне Міхася. Шостая карціна — лістапад 1917 года, падзел зямлі, гібель Ганкі (сяброўкі Марысі), зварот Марысі да Міхася. Сялянская маса на чале з Анішчуком і Міхасём ідзе на панскі маёнтак, — Кастрычнік у беларускай вёсцы наступіў.

Хораў у оперы вельмі багата, яны ёсць ва ўсіх карцінах. Амаль усе хоры (таксама як і асноўныя сольныя партыі) пабудаваны на матэрыяле беларускай народнай песні. Найбольш значныя з іх: у першай карціне хор дзяўчат «у зялёным, у садочку», гульня ў гарэлкі, жартаўлівая ігравая песня «Па гарохаўю, па ячынню», заключны хор—провады Міхася. У другой карціне — два абрадавых вясельных жаночых хоры і хор параненых (мужчынскі) у канцы карціны. У трэцяй карціне—два вялікіх хоры новабранцаў (мужчынскія) і дзве жніўных песні (жаночыя), якія ў канцы карціны зліваюцца ў адзін агульны масавы хор—сцэну. У чацвертай карціне толькі мужчынскія хоры: салдацкая песня «Не кладзіце мяне, братцы» і сцэна паўстання. У пятай карціне хораў небагата, у шостай—два змешаных хоры: песня пра зямлю і фінальны хор «Наперад мужна Ленін нас вядзе». Акрамя асобных хораў, значнае месца аддадзена хору ў развіцці драматычнага дзеяння.

Асноўныя персанажы оперы маюць дастатковую колькасць закончаных па форме музыкальных элементаў—арый,



Кампазітар Е. К. ЦІКОЦКІ



Лібрэтыст — паэт П. БРОЎКА.

песень, дуэтаў і т. п. Так, Міхась мае вялікую арыю ў першай карціне, арыёзу ў трэцяй, песню паўстання ў чацвертай і арыёзу ў шостай карціне. Марысі адведзена самая значная ў оперы арыя ў пачатку другой карціны, песня ў першай карціне і дзве арыёзы (пятая і шостая карціны). Ганка мае арыю ў першай карціне, песню ў другой карціне і арыёзу ў шостай. Анішчук—арыёза ў трэцяй карціне і дзве арыі: вялікая ў чацвертай карціне і меншая ў шостай. Змітрок—арыёза ў другой і трэцяй карцінах і арыя ў шостай. Салдат Сымон Пясоцкі—дзве арыёзы: апавяданне аб сне ў чацвертай карціне і сцэна-арыёза ў пятай карціне. З ансамбляў найбольш значныя: вялікі дуэт Марысі і Міхася ў першай карціне і меншы ў трэцяй, дуэт Марысі і Ганкі ў першай карціне, трыё Закрэўскіх (бацька і сын) і аканома—у шостай карціне.

Асобныя хоры, арыі і ансамблі звязаны меладычнымі рэчытатывамі адпаведна ходу развіцця драматычнага дзеяння.

Аркестру ў оперы я ўдзяляю вялікую ўвагу. Побач з суправаджэннем вакальных партый вялікае месца займае аркестровая распрацоўка лейтматываў—вядучых матываў-характарыстык асобных персанажаў і сцэнічных палажэнняў. Вялікая частка лейтматываў пабудавана таксама на народнай мелодыцы,—напрыклад, пастушы найгрыш, якім адкрываецца першая карціна, гэта вядомая песня «Я табун сцерагу»; лейтматыў Міхася заснаваны на меладычных зваротах песні «Ты чырвоная каліна»; лейтматывы Марысі перагукваюцца з матывамі песень «А ў полі вярба» і «Сягоння я тута, а заўтра паеду». Тэма паўстання ўзята са злучэння мелодыкі беларускай рэкруцкай песні і рэвалюцыйнага меласа. Тэма вайны ўзнікла з песні «Выйду я ў садок, у садзе прахаджуся».

Музыка першага акта оперы мною была закончана яшчэ ў жніўні мінулага года, а ўвосені ён быў аркестраван. Вялікую дапамогу ў гэтай частцы работы аказаў мне дырыжор Е. А. Акулаў, асабліва ў частцы інструментоўкі.

У далейшым, калі я здаў першы акт у работу Дзяржаўнаму беларускаму тэатру оперы і балета, я працаваў і прадаўжаю працаваць у шчыльнай творчай сувязі з калектывам тэатра. Многімі каштоўнымі ўказаннямі я абавязаны артыстам тэатра, якія выконваюць вядучыя партыі ў маёй оперы. Многія салісты і салісткі оперы, а таксама артысты хора і аркестра сваёй таварыскай крытыкай аказалі мне неацанімую дапамогу ў паляпшэнні асобных сцэн і дапамаглі пазбегнуць залішніх нязручных месц і неапраўданых цяжкасцей у тэсітуры, падтэкстоўцы, гарманічных зваротах і ў меладычнай лініі сваіх партый і ўсёй оперы ў цэлым.

Лічу патрэбным адзначыць выдатную работу галоўнага хормейстра Опернага тэатра А. С. Сцяпанава над хорамі першага і другога актаў.

У апошні час у работу над операй уключыўся дырыжор тэатра М. Э. Шнейдэрман, які здолеў у кароткі час падрыхтаваць аркестр і сольных выканаўцаў да паказу першага акта ў канцэртным выкананні на эстрадзе. Гэты паказ прынёс мне велізарную карысць, даўшы магчымасць добра праслухаць адзін акт і праверыць сумеснае гучанне салістаў, хора і аркестра. Праўда, поўнага ўражання такі паказ даць не можа, бо адсутнічаюць два важнейшых кампаненты опернага спектакля: акцёрская ігра і вонкавае афармленне (дэкарацыі, касцюмы, грым), а галоўнае—няма яшчэ рэжысёрскай работы. Акрамя таго, размяшчэнне аркестра ў адной плоскасці з салістамі і значнае аддаленне хора ад авансцэны не можа не скажаць агульнай гучнасці і немінуча павінна стварыць уражанне значнай (калі не катастрафічнай) перагрузкі аркестра. Гэта неабходна мець на ўвазе пры падобных паказах і агаварваць гэта ў прадмове да канцэрта.

Я скончыў ужо тры акты (5 карцін з шасці) оперы ў клавіры. У сучасны момант я працую над апошняй, шостай карцінай оперы і аркеструю трэцюю карціну. Спадзяюся ў пачатку красавіка мець магчымасць паказаць у канцэртным выкананні другі акт. Зараз уся мая работа праходзіць пры бліжэйшым і вельмі актыўным удзеле ўсяго калектыва Опернага тэатра і ў асаблівасці тав. Шнейдэрмана, з якім я заўсёды сустракаюся і з якім мы карэкціруем клавір і партытуру літаральна патактна.

Да апошніх дзён бліжэйшы ўдзел у стварэнні оперы прымае і мой суаўтар—П. Броўка. Ен зрабіў не толькі некалькі варыянтаў некаторых сцэн (і нават цэлых карцін—напрыклад, чацвертай, у якой мы значна ўзнялі вобразы Анішчука і Міхася), але, што самае цяжкое і крапатлівае, ён цярпліва, вельмі інтэнсіўна, добрасумленна і з вялікай любоўю да стварэння беларускай оперы робіць усе дробныя выпраўленні, дапіскі і скарачэнні тэкста, неабходныя па меры развіцця работы над музыкай оперы.

Зараз, калі я набліжаюся да канца работы над операй, у мяне ёсць адно жаданне: найхутчэй пабачыць сваю працу на сцэне нашага Опернага тэатра, аддаць яе на суд шырокай совецкай грамадскасці, пачуць крытыку працоўных мас БССР і ўсяго СССР.

У пераказе маёй работы над стварэннем беларускай оперы я не магу прайсці міма раду фактаў, тармозячых гэту работу. Першы акт оперы, паказаны ў адкрытым канцэрце толькі зараз, мог быць з такім-жа поспехам паказан чатыры месяцы назад, бо клавір і партытура ўсяго акта здадзены мною тэатру поўгода назад. Калі-б тэатр нармальна працаваў і ўвага да стварэння беларускай оперы ўвесь час была на вышыні, то праца мая рушыла-б значна далей і тэатр даўно ўжо рыхтаваўся-б да сцэнічнага паказу ўсяго спектакля, а не да канцэртнага паказу, які ўрэшце мяне, як аўтара, не зусім здавальняе. Гэтаму ў асноўным перашкаджаюць дзве прычыны: па-першае, адсутнасць рэжысёра-пастаноўшчыка, які невядома калі прыступіць да работы (а ён неабходны зараз); па-другое, адсутнасць сцэнічнай пляцоўкі ў тэатра, пытанне з заканчэннем якой (у новым тэатры) да гэтага часу вісіць у паветры.

Я лічу, што пытанне стварэння беларускіх совецкіх музыкальных спектакляў (оперы, балета)—справа не толькі аўтароў, але і ўсёй нашай грамадскасці, і зусім недапушчальны і незразумелы абыякавыя адносіны да гэтай вялікай, палітычна значнай справы ў галіне мастацтва як нашага друку, так і асобных кіруючых працаўнікоў, у прыватнасці—Упраўлення па справах мастацтваў.

Е. ЦІКОЦКІ.

ДРУГАЯ АЛІМПІЯДА РАБОТНІКАЎ СУВЯЗІ

На прадпрыемствах сувязі пачалася падрыхтоўка да другой усебеларускай алімпіяды мастацкай самадзейнасці, якая адбудзецца ў першай палове красавіка.

Першая ўсебеларуская алімпіяда сувязістаў, праведзеная ў верасні 1936 года, была, параўнальна, не вельмі шматлюдная. У ёй прыняла ўдзел усяго пяць калектываў і каля 25 салістаў. Другая алімпіяда абяцае быць значна больш шматлікай і цікавай.

У сувязі з падрыхтоўкай да алімпіяды ў радзе раёнаў ужо створаны новыя самадзейныя калектывы. У Оршы нядаўна арганізаваны хор, танцавальны калектыў і струнны аркестр. У Дрысе і Ветрыне створаны новыя музычныя гурткі. У Барысаве зноў пачаў сваю работу джаз.

Напярэдадні ўсебеларускай алімпіяды, у канцы сакавіка будуць праведзены раённыя адборачныя алімпіяды. На дапамогу раёнам будуць пасланы кансультанты Дома народнай творчасці БССР.

Адначасова ў раёнах будуць арганізаваны выстаўкі ўзораў народнай творчасці (жывапіс, рукадзелле, разьба і г. д.).

„Вяселле ў Малінаўцы“

Паяўленне совецкай аперэты наносіць руйнуючы ўдар той закасцянелай, руціннай тэорыі, якая адводзіла аперэце, як жанру, якоесьці асаблівае месца, лічачы, што ў аперэтачным жанры не можа гучаць совецкая тэматыка, героіка і рамантыка нашых дзён.

З'яўленне музыкальнай п'есы «Вяселле ў Малінаўцы» з'яўляецца новай, яшчэ больш моцнай спробай павярнуць нашу аперэту з пратаптанай дарожкі сляпога пакланення перад венскімі ўзорамі на шлях рэалістычнага мастацтва.

Галоўныя кампаненты ў гэтай совецкай аперэце якраз і з'яўляюцца тым фундаментам, на якім можна будаваць здаровы музыкальны спектакль, хвалюючы нашага гледача. Удалая, перш за ўсё за нямногімі агаворкамі, музыка маладога кампазітара Б. Александрава, з добрым гучаннем хораў і ансамбляў і з меладычнымі дуэтамі. Добра пабудавана, са сцэнічнай разнастайнасцю і ўлікам сцэнічнага ўздзейнічання на гледача, драматургічная фабула лібрэта Л. Юхвіда і В. Тіпота. Праўда, лібрэта не пазбаўлена некаторых зрываў, асабліва ў апошняй карціне, дзе сюжэт ідзе на зніжэнне.

Самы факт пастаноўкі аперэты «Вяселле ў Малінаўцы» Тэатрам музыкальнай камедыі трэба вітаць. Замест сюсюкання і алькоўных размоў са сцэны загучэла совецкая рамантыка, з'явіліся акторы не ў венскіх закасцянелых масках фрывольнага штампа, а ў вобразах жывых, блізкіх нам людзей.

Прымаючы ў цэлым паяўленне гэтай аперэты, як факт станоўчы, трэба праналізаваць работу тэатра, яго абыходжанне са сцэнічнымі сродкамі матэрыялу, прадастаўленага яму аўтарамі—кампазітарамі і лібрэтыстамі.

Я цяпер выступаю як рэцэнзент. Але-ж я, як рэжысёр драматычнага жанра, трапляю часта на старонкі газеты ў якасці рэцэнзуемага, і таму я перш за ўсё, улічваючы свой вопыт, не хачу дапусціць адной часта дапускаемай у рэцэнзіях асноўнай памылкі. Часта ўдала зроблены аўтарам сцэнічны твор поўнасцю прыпісваюць заслузе пастаноўшчыка і таленавітасці актораў і, наадварот, часта слабы драматургічны матэрыял узвальваюць поўнасцю на галовы пастаноўшчыка і актораў, не заўважаючы таго, якая велізарная работа па паляпшэнню слабога аўтарскага матэрыялу была прароблена тым ці іншым тэатральным калектывам.

Пры разглядзе пастаноўкі трэба перш за ўсё аддзяляць работу аўтара ад работы тэатральнага калектыва. Узяўшы для ацэнкі рэжысёрскую работу над спектаклем «Вяселле ў Малінаўцы», можна ўгледзець рад буйных пастановачных памылак, да якіх у першую чаргу трэба аднесці разнабой, эклектычнасць стылевага прыёму пастаноўкі. У спектаклі можна ўбачыць нечакана побач з рэалістычным прыёмам і гратэск-буф, і рэцыдыў «венщчыны» ў дрэнным сэнсе гэтага разумення, і па-за ўсякім стылем — проста безгустоўнае месца.

Кожны тэатр, беручы для сцэны той ці іншы драматургічны матэрыял, будзе праводзіць над ім работу, на мой погляд, па аднаму з трох шляхоў — ці ісці за аўтарам, ці дапаўняць аўтара, вышукваючы больш глыбокую падтэкставую трактоўку матэрыялу, ці рабіць на аўтарскім матэрыяле поўны эксперымент, ствараючы як-бы новы твор.

Каб пайсці па двух апошніх шляхах, патрэбна, вядома, вялікая эрудыцыя як агульная, так і спецыяльная. Рэжысура Тэатра музыкальнай камедыі скромна пайшла па першаму шляху, — шляху следвання за аўтарам, але пайшла ўсляпую, без крытычнага аналізу мастацкіх і палітычных асноў матэрыялу. І атрымалася так, што там, дзе ў аўтара добра, там і на сцэне выйшла больш ці менш добра (і то не заўсёды), а там, дзе ў аўтара слаба, дык і на сцэне слаба.

У першую чаргу трэба ўказаць на мастацка няправільную і палітычна шкодную трактоўку вобраза бандыта Папандапула, дзе рэжысура і выканаўца сваёй трактоўкай ідэалізуюць гэтага мацёрага афэрыста і забойцу, робячы з яго гумарыста-одэсіта, гэткага сімпатычнага хлопца, які быццам толькі па слабаволлю трапіў у шайку бандытаў. Гэтая трактоўка яшчэ больш павялічваецца сцэнічным націскам выканаўца. І атрымоўваецца ідэалізацыя, ды яшчэ ў паганым гусце старога так званага «одэскага» анекдота.

Я не збіраюся навязваць у гэтай чыста таварыскай парадзе сваю—рэжысёра драматычнага тэатра—канцэпцыю, усё вельмі як-бы асур'ёзніваць. Не! Я разумею, што аперэта мае сваю спецыфіку, сваю ўласцівую ёй тэатральнасць. Адмяняць гэтых і іншых ёй уласцівых канонаў (своеасаблівыя рытмы, тэмпы, змены і г. д.). можа пацягнуць за сабой знішчэнне аперэты наогул, як жанра.

Я за захаванне ўсіх жанраў і відаў сцэнічнай работы нашага слаўнага совецкага фронта мастацтва. Але я хачу прад'яўляць і да сябе, і да сутаварышоў па рабоце патрабаванні мастацка-палітычнага такту і пачуцця. І тут яшчэ больш сур'ёзны папрок трэба зрабіць выканаўцу ролі Яшкі-артылерыста. Тут ужо не можа быць месца апраўданням, што аўтар, маўляў, кудысьці цягне ў бок. У аўтара гэта якраз наш хлопец—жартаўнік, балагур, а перакладаючы на мову амплуа—прастак. У выканаўца-ж, артыста Домбіка, гэта — дурань. А Яшка атрымоўвае адказную совецкую работу, на яго абапіраюцца ў перыяд аднаўлення совецкай гаспадаркі. Які разрыў паміж логікай вобраза і тым, як увасабляе яго на сцэне арт. Домбік. Чаго варты і рыжы парык, і руженькі, фатавата напудраны твар Яшкі. А Яшка-ж, пакутуючы паўтара года, праз франты і разруху дабіраўся да сябе, у любімую вёску, да сваіх аднавяскоўцаў. Страта пачуцця мастацкага такту і чуцця наогул часта ўласціва арт. Домбіку. Не гледзячы на патрабаванне грамадскасці адкінуць адсябяціну, арт. Домбік карыстаецца ёю і зараз.

Пастаноўка «Вяселле ў Малінаўцы» грашыць у радзе месц у трактоўцы ўзаемаадносін якойсьці падсалоджанай экзотыкай. Гэта датычыць і некаторых гарнітураў, асабліва ў балеце, і прыгладжаных, мала выразных дэкарацый.

У аснову стылевага прыёму пастаноўкі трэба было-б узяць гераічную рамантыку і народны гумар, інтэрпрэтыраваныя, вядома, спецыяльнымі сродкамі аперэты. Да гэтага, як мне здаецца, найбольш правільнага плана вырашэння ўсёй пастаноўкі і асобных вобразаў бліжэй за ўсё падышла Е. М. Папко — актрыса з вялікім сцэнічным абаяннем, якая і на гэты раз знайшла выразныя фарбы і змагла пераключыцца ад «венщчыны» да стварэння совецкага вобраза — Ганусі. Героіка-рамантычны і пераканаўчы К. В. Крылоў у ролі чырвонага камандзіра. Добрыя і пачуццёвыя дуэты Э. Я. Грасавай і В. Н. Шчэрбаковай. Сагрэты рамантыкай і сольныя арыі Э. Я. Грасавай. Просты і прыемны Н. Н. Бычкоў (дзед) і Г. П. Гераскін (чырвонаармеец Пётр). Неабходна паменшыць некаторы націск і пазіроўку акторам З. В. Вінаградавай, А. А. Мартаву, В. Н. Анохіну і А. К. Ракшціс, вобразы ў якіх намячаюцца нядрэнна.

На добрым узроўні музыкальнага і сцэнічнага чуцця стаіць работа дырыжора Д. Л. Пекарскага. Эмацыянальна і вельмі выразна пастаўлены танцы балетмейстарам В. М. Разанавым, але часам стылевы характар іх парушаецца. Не трэба забывацца, што дзея, хоць-бы і аперэтачная, адбываецца ў украінскай вёсцы. Выразная і яркая работа ў балеце В. В. Куляшова, Е. П. Хаспекавай, М. П. Разанцавай і З. В. Сугробкінай.

Спектакль прымаецца гледачом цёпла і гэта яшчэ раз даводзіць неабходнасць паказу на нашай сцэне «Вяселля ў Малінаўцы». Але прыём гледача абавязвае да таго, каб усе памылкі — разнабой у стылі, агульная электыка, нацягнутасць і фальш асобных вобразаў былі зараз-жа выпраўлены. Тады аперэта загучыць яшчэ ярчэй, яшчэ выразней, а галоўнае — правільней. Трэба інакш скампанаваць і ўсю апошнюю карціну, разарваную і аўтарам і яшчэ больш тэатрам. Для ўзмацнення гэтай карціны, мне здаецца, неабходна перанесці ўсю другую частку танцаў (масавую чырвонаармейскую пляску) у гэту карціну, як эмацыянальны, выяўлены ў танцах, гімн пераможцаў—чырвонаармейцаў. Гэта выручыць фінал п'есы, ды і танец баявой перамогі будзе больш лагічным пасля сцэны разгрому белабандытаў.

В. ДАРВІШАЎ,

Мастацкі кіраўнік Віцебскага Белдзяржтэатра.

ЯКУШ СВІТКА І МАРКІЗ ПАСТОРЭ

ПРАЦЯГ

— Што, фэрты, галуном абшытыя,—прышлі з жабракоў апошнюю кашулю здзіраць?! — крычаў дзед, ідучы да французаў. — Паскудную польскую шляхту зноў на нашу шыю пасадзіць хочаце? На нашых спінах яшчэ не загаіліся шарамы ад бізуноў каралеўскай Польшчы, а вы прышлі нас зноў як быдла ў варшаўскі хамут заганяць? Га?!

Французы стаялі нерухома. Зірнуўшы на суровыя, змучаныя твары партызанаў, яны адразу зразумелі, што іх жыццёвыя шляхі абрываюцца каля гэтай рэчкі. Зараз смерць. Грэнадзёр прыўзняў над зямлёй кіек, барабаншчык намацаў пад барабанам кінжал, маркітанка моцна сціснула кулакі.

Нечакана недзе далёка ў пушчы загаласіла жанчына. Поўны невыказнага болю зык паплыў над знішчанай зямлёй і водгуллем залунаў каля рэчкі. Здавалася, лопнула ў цымбалах нацягнутая да канца струна.

— Бі-і іх, гадаў!!—жудасна закрычаў малады партызан і рынуўся з дубінкай да грэнадзёра, але адразу-ж спыніўся, неяк разгублена гледзячы то на жанчыну, то на дзеда.

— Ува-а! Ува-а! Ува-а! — ламентаваў абуджаны партызанам, раней нікім з іх не заўважаны трохтыднёвы віцеблянін. Бездапаможны крык дзіцяня тут, каля рэчкі, адчуўся людзьмі больш страшна, чым стрэл з дванаццаціфунтовага едзінарога.

Дзед падышоў да Маркітанкі, зірнуў ёй за пазуху і запытаўся:

— Малец ці дзеўка? Ахрысцілі як?—Бачачы, што яго не разумеюць, ён грукнуў сабе кулаком у грудзі і сказаў. — Вось я, напрыклад, Якуш Світка, а дзіцянё як зваць?

Пачуўшы добра знаёмае імя, французы ўздрыгнулі. Нават па спіне грэнадзёра хваляй пракаціўся халадок, як пад Шэнграбенам, калі расійскія грэнадзёры найхрабрэйшага Багратыёна з д'явальскім рогатам ішлі ў штыхі пад самыя жэрлы французскіх гармат.

— Жульён, — адказала глухім голасам маркітанка.

— Жулен. Відаць, што жулік. Вельмі ўжо галаслівы. Хоць каратыш, ды не варона-кныш.

— Ува-а! Ува-а! — цалкам згадзжаўся, здавалася, з думкай Якуша Жульен. Дзед пстрыкнуў пальцамі і паказаў матцы на дзіцянё:

— Цыцку яму дай, мадама! Цыцку дай французжонку!

Лізбет не зразумела слоў страшнага партызана. Яна не зразумела, з якім намерам ён, дзед, пачаў ёй нечакана расшпільваць кофтку на грудзях. Яна яшчэ мацней сціснула кулакі, выскаліла зубы, гатовая рынуцца адна на партызанаў. У гэты момант дзіцянё знайшло патрэбнае і, зацмокаўшы, змоўкла. Якуб Світка, гледзячы на яго, усміхаўся:

— Муха-яруха. Бычок-трацячок.

І тады матка, таксама ўсміхаючыся, пачала гаварыць нешта невядомае дзеду хутка-хутка, як толькі гавораць парыжанкі.

— Ну, якраз, як нашы бабы каля студні, — заўважыў малады партызан, зацікаўлена гледзячы на Лізбет.

— Шэр амі *) — звярнуўся да дзеда расчулены Луазо і скінуў з галавы вялікую мядзвежую шапку грэнадзёра.

— Дзякуй мон пэр*) — сказаў, блытаючы мовы Поль і таксама зняў ківер з чорным султанам.

— Ну ладна, шарамыжнікі! Ладна!—заўважыў дзед, беручыся за капшук і люльку. — З бабамі, з калекамі ды з сысунамі мы не ваюем. Ідзіце сабе з богам далей, але спачатку пагаворым.

Што ты, служывы, у чужой клеці загубіў? — звярнуўся Якуш Світка да Жана Луазо. — За чым да нас прыходзіў? Дайшоўшы да сваёй хаты, куды пойдзеш? Медалі на грудзі, торбу цераз плячо, ды на паперць «Лазара» спяваць? Га? — і дзед па-жабрацку працягнуў руку. Грэнадзёр насупіўся і нічога не адказаў. — А з цябе-ж, з такога здаровага дзядзькі, найлепшы-б на ўсю ваколіцу каваль быў. Зямля-б ад молата вакол тваёй кузні дрыжала. Меў-бы ад людзей і пашану і грошы. А цяпер? Пану Атроху задалі троху? Эх, ты, банапартаўскі папіхач.

З табой іншая справа, — паказаў Світка на Гантрана. — Калі-б я тваім бацькам быў, скінуў-бы я табе, такому жаўнеру, порткі, расклаў на лаўцы, ды вось гэтым самым паяском з кутаскамі так адсцёбаў, што ты-б цэлы год пачосваўся-б. Зямлю пахаць, блазнюк, трэба, а не ваяваць! Зразумеў?! — раптам закрычаў дзед, выцягваючы з-за пояска пісталет.

Барабаншчык збляднеў і пахіснуўся. Яму прыгадалася родная хата з пачарнелымі глінянымі сценамі і з дзіравай, ветрам растрапанай страхой. Бацька, матка і пяць дзяцей сядзяць за сталом вакол нішчымнай, ледзьледзь прысоленай бабовай пахлёбкі.—Дзе гэта цяпер наш Поль? — пытаецца невядома ў каго матка, выціраючы падалом спадніцы самы маленькі з пяці кірпаты нос. Бацька маўчыць. Паабедаўшы, ён устае, кладзе за пазуху перапечку, пару каштанаў і едзе на свой кавалак зямлі.

— Бывайце, — шэпча Поль, не зводзячы вачэй з дзеда, але што гэта...

Світка, выцягнуўшы з-за пояска пісталет, тройчы плюнуў на яго, адкінуў у бок і ўзяў у маладога партызана дубінку. Схіліўшыся ў крук, ён пачаў скародзіць гэтай дубінкай дарожную гразь, і тады ўсё зрабілася зразумелым. Поль Гантран, усміхаючыся, сцвярджальна заківаў галавой і тройчы плюнуў на свой барабан.

— Ага, цяпер зразумеў? — сказаў дзед. — Зямлю пахаць, смаркач, трэба, а не ваяваць! А з барабана твайго ў гаспадарцы добрая трохвядзёрная дзежка выйдзе, ці кубел, і ўжо на худы канец—квашня.

Зірнуўшы на маркітанку, Світка хацеў нешта сказаць, але толькі крякнуў. Выцягнуўшы з хатуля коўдрачку, ён працягнуў яе Лізбет:

— На, гарапашная матка! Захутай свайго жуліка. Нядаўна мы затрымалі ваш абоз і здалі нашым казакам, а коўдрачка засталася. Ды калі толькі, маладзіца, заўважыш на шляху хату, смела заходзь пагрэцца. Знішчылі вы нас зусім, але з дзіцянём цябе ніхто з тутэйшых сялян пальцам не кране. Мы простыя, працавітыя людзі, мы не звяры, як ваш імператар Напалён і мірадзёр Пасторскі. Ну, а цяпер з богам далей. Бывайце! Больш нас не чапайце!

Французы, не даючы веры самім сабе, пераходзілі па масту праз рэчку.

— Кланяйцеся ад беларускіх сялян віленскім панам! крыкнуў ім наўздагон Якуш Світка. — Няхай хаўтуры па сваіх сынах спраўляюць! І ад пана Бітнага-шляхты таксама кланяйцеся! Ен нядаўна цалкам атрымаў ад нас свае чыншавыя поўста бізуноў!

48 лінейны полк зноў крочыў па шляху праз Сянно да Парыжа.

Віцебск, 1938.

*) Мілы сябра

*) Дзякуй мой бацька.

Выпраўленне памылкі

У №№ 29 і 30 нашай газеты за 1937 год былі змешчаны справаздачы супрацоўніка рэдакцыі тав. Есакова аб нарадзе актыва Белрадыёкамітэта і вытворчай нарадзе аркестровага цэха Філармоніі БССР, на якіх дырыжор тав. Красавіцкі быў абвінавачан у трацкізме і гэтае абвінавачанне адзначана ў справаздачах.

Як высветлілася, гэтае абвінавачанне было высунута былым кіраўніком Белрадыёкамітэта Гарачовым беспадстаўна і пры праверцы рэдакцыяй не пацвердзілася.

На супрацоўніка рэдакцыі тав. Есакова, які не праверыў своечасова прыведзены ў справаздачах матэрыял, накладзена адміністрацыйнае спагнанне.

Рэдакцыя просіць прабачэння ў тав. Красавіцкага і ў чытачоў за змяшчэнне справаздач, у якіх высоўвалася паклёпніцкае абвінавачанне.

ХРОНІКА

15 сакавіка 1938 г. прыведзен у выкананне прыгавор Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР ад 13-га сакавіка 1938 г. аб расстрэле асуджаных па справе антысовецкага «праватрацкісцкага блока» — Бухарына Н. І., Рыкава А. І., Ягоды Г. Г., Крэсцінскага Н. Н., Розенгольца А. П., Іванова В. І., Чарнова М. А., Грынько Г. Ф., Зеленскага І. А., Ікрамава А., Хаджаева Ф., Шаранговіча В. Ф., Зубарэва П. Т., Буланава П. П., Левіна Л. Г., Казакова І. Н., Максімава-Дзікоўскага В. А., Кручкова П. П.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята—25-394, рэдактара—20-831. Уп. Галоўлітбела № 4263.